незалежная газета

№ 27 (672) 21 ліпеня 2010 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Заснаваная ў лістападзе 1906. Аднаўленая ў маі 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у серады



**«Басовішча» было пякельным**

Старонка 11



**Ван Дам хацеў арандаваць «Беларусьфільм» за $300 тысяч**

Старонка 11



**Гісторыя Беларусі. Полацк. Паўночная версія**

Старонка 12

У НУМАРЫ

**Па слядах Казуліна**

Уладзімір Някляеў мае намер стаць «дэлегатам» чарговага Усебеларускага народнага сходу. **Старонка 8.**

**«Трымаю дзве каровы, тры быкі, пчол. Выжыву!»**

Настаўніка нямецкай мовы з-пад Бешанкавіч Георгія Станкевіча звольнілі за палітыку. **Старонка 3.**

**Курэйчык падазрае Латушку**

Звольненага драматурга аднавілі на працы ва Універсітэце культуры. **Старонка 5.**

**Падарожжа на Поўдзень — адкрыццё Усходу**

Пра Крым татарскі піша Сяргей Харэўскі. **Старонка 13.**

**Марскія канькі ў нашых рэках**

Новыя віды беларускай фаўны. **Старонка 15.**




«Наша Ніва» з'яўляецца ў кіёсках у Мінску ў сераду ад абеду, у рэгіёнах — у чацвер. На газету можна і падпісацца — глядзі **старонку 2**.

# Вось сімвал твой, саюзная дзяржава

Беларусь і Расія абменьваюцца цяжкімі абвінавачаннямі.

Расійскія СМІ працягваюць інфармацыйную атаку на беларускае кіраўніцтва. Да тэлеканала НТВ далучыліся ОРТ і «Россия».

### «Хросны Бацька-2»

Але найперш па НТВ была прадэманстраваная другая частка «Хроснага Бацькі». Тых, хто глядзеў частку першую, працяг расчаруе. Часткова выкарыстаныя тыя ж кадры і тыя ж факты, толькі перастаўленыя месцамі.

Лукашэнку параўноўваюць з Саакашвілі. Маўляў, абодва непрадказальныя, абодва хочуць у Еўропу, але не ведаюць, як туды трапіць. Значная частка фільма прысвечаная Курманбеку Бакіеву, якога прытуліў у сябе Лукашэнка.

Выклікаюць сумнеў кадры беларускага кадэбіста, які сядзіць спіна да камеры і разважае пра падабенства Лукашэнкі і Бакіева. Пры гэтым чэкіст увесь час кажа «Белоруссия» замест «Беларусь». Нават калі супрацоўнік КДБ «ліпавы», гэта відавочны сігнал беларускім чэкістам, што Расія гатовая іх падтрымаць.

Вядоўца перадачы кажа аб сенсацыйных кадрах адпачынку Аляксандра Лукашэнкі ў Аўстрыі, пры гэтым мы назіраем удзел кіраўніка дзяржавы ў традыцыйнай мінскай лыжні ў Раўбічах.

Расказваецца таксама пра адносіны Аляксандра Лукашэнкі з беглым расійскім алігархам Барысам Беразоўскім. А таксама пра ўдзел апошняга ў судзе над грамадзянінам ЗША Эмануілам Зельцарам.

Аўтары фільма сцвярджаюць, што за 15 гадоў кіравання Лукашэнкі Расія выдаткавала на дапамогу яму 52 мільярды даляраў.

Тэлеканал таксама працягваў капацца ў бруднай бялізне. Апроч гісторыі з Ірынай Абельскай прагучала, што Лукашэнку «бачылі на замежных курортах разам з паўаголенымі валейбалісткамі».

Цэнтральнай тэмай зноў сталі гучныя знікненні апанентаў Лукашэнкі. Напрыканцы аўтар перадачы выказвае меркаванне, што перад выбарамі кіраўнік Беларусі можа «прызначыць» вінаватых у гэтых знікненнях.

### Цэнзары прамаргалі

І калі «Хроснага Бацьку» пільныя цэнзары беларускім гледачам не паказалі, то рэпартаж пра Лукашэнку ў навінах тэлеканала ОРТ прамаргалі.

Інфармацыйнай нагодай для рэпартажу на першым расійскім канале стаўся зварот беларускіх апазіцыянераў у Генеральную пракуратуру з мэтай завядзення крымінальнай справы па фактах, паказаных у «Хросным Бацьку».

**Працяг на старонцы 8.**



Расійскія тэлеканалы пра Лукашэнку: «Палітычны хамелеон сыдзе бясслаўна».

• Вока за вока, зуб за зуб. Дзяржаўныя СМІ расказваюць усю праўду пра саюзную дзяржаву. **Старонка 8.**

• «Малдаўская апазіцыя абараняла не Вароніна, а свае мэты. І здабыла поспех». **Старонка 8.**

• Андрэй Вардамацкі: Уплыў расійскіх навін змяншаецца. **Старонка 9.**

• Даражэйшае, затое не расійскае: венесуэльская нафта. **Старонка 4.**




# Кіргізскі сцэнар для беларускага хамелеона: ці будуць у Мінску страляць?

Масква сваімі фільмамі і паводзінамі намякае: мы такое падтрымаем. Піша **Андрэй Дынько**.

Расія дзейнічае з Беларуссю па кіргізскім сцэнары, які прывёў да скідання Бакіева.

Шчодрыя пасулы змяніліся эканамічным ціскам. Пайшла інфармацыйная хваля. Следам за НТВ таксама ОРТ і РТР ударылі па Лукашэнку. Яшчэ не з усіх гарматаў, але некаторыя снарады ўжо даляцелі да Беларусі. Лукашэнкаўская цэнзура бадзёра сканфіскавала тыраж «Нашай Нівы», але прапусціла сюжэт у навінах, дзе кіраўніка рэжыму вінавацяць у забойствах. Чырвонай ніткай праз усе расійскія ролікі праходзіць: Лукашэнка — палітычны хамелеон, ягоны час скончыўся.

Дзеля добрых адносін з Расіяй Беларусь павінна змяніць лідэра. На каго? Без удакладненняў. Кіргізскі сцэнар Расіі прадугледжваў далейшую эканамічную замарозку перад выбарамі. А таксама медыйную апрацоўку.

Апазіцыя ў Кіргізіі рыхтавала змену ўлады ў рэгіёнах. Там праводзіліся народныя сходы, агульнанацыянальны завершыў іх у Бішкеку. У Кіргізіі, нагадаем, расійскае ТБ стала на бок вуліцы. Аднак і Лукашэнка будзе вучыцца на вопыце Бакіева. Апошні так і не перакрыў расійскага ТБ і прэсы, і ў вырашальны момант Бішкек глядзеў маскоўскія каналы.

**Працяг на старонцы 7.**

# Сабор будуюць — косткі выкідаюць

**На будпляцоўцы вакол адноўленага Успенскага сабора ў Віцебску экскаватары выкопваюць людскія парэшткі. Чые? Адказныя асобы не імкнуцца разбірацца.**

Хто дакладна не мог атрымліваць асалоду ад усіх прыемнасцяў «Славянкі-2010» у Віцебску — дык гэта будаўнікі ля Успенскай царквы. У самую спёку яны «гарэлі» на працы. Асноўныя сілы кінутыя на парадкаванне прысаборнай плошчы.

Мы падышлі да будоўлі з боку былога базыльянскага кляштара (цяпер станкаінструментальны тэхнікум). Не пабачыўшы знакаў, якія б забаранялі праход, спакойна змаглі паздымаць будаўнічыя ямы. Ніхто не звяртаў на нас увагі.Тут і трапілася на вочы костка. Потым яшчэ адна...

Косткі былі паўсюдна: у ямах, пад коламі і каўшамі экскаватараў. Косткі людзей. Могілкі? Пахаванні ўніяцкіх святароў? Аднак нават мы, маладыя і нявопытныя гісторыкі, маглі сказаць, што косткам не больш за сто гадоў.

Тут нас нарэшце заўважыла вартаўніца. На нашае адчайнае: «Гэта ж людзі!» — адрэагавала млява. У Віцебску косткі паўсюль — толькі капні. А сама яна тут першы дзень і нічога не ведае.

Наваколле замерла, стомленае ад спёкі: сонца пякло нават увечары. І не верылася, што зусім блізка народ гуляе на фестывалі...

## Пракуратура сказала — быдлячыя

«Ёсць меркаванні, што ў 1930—1940-я ў падвалах разбуранага сабора расстрэльвалі віцебчукоў чэкісты», — кажа археолаг Ігар Цішкін. — Калі тут палонных пастралялі фашысты, чаму пасля заканчэння вайны на гэтым месцы не паставілі помнік ахвярам? Дакументы ж НКУС ад нас схаваныя».

Тэорыю, што гэта парэшткі людзей, пахаваных на прыходскіх могілках пры саборы ў XVII — XX ст., І.Цішкін адпрэчвае. У гэтай частцы Успенскай гары могілак быць не магло. Дый косткі б ляжалі роўненька. Былі б рэшткі трунаў, вопраткі, кажа ён.

У пачатку 1990-х І.Цішкін кіраваў раскопкамі на гэтым месцы. «Калі ў адным з шурфоў я знайшоў чалавечыя парэшткі, адразу звярнуўся ў пракуратуру, каб узбудзілі крымінальную справу. Мне адмовілі: нібыта шмат з тых костак, якія яны ўзялі на экспертызу, належыць жывёлам».

**Ігар Цішкін**

Нар. у 1961 у Віцебску. Гісторык, грамадскі дзеяч, адзін з лідэраў «нефармалаў» у другой палове 1980–х. Ад 1982 — навуковы супрацоўнік Віцебскага абласнога музея. Ад 1988 — археолаг у прадпрыемстве «Віцебскпраектрэстаўрацыя». У 1986 з аднадумцамі стварыў клуб «Узгор'е», які абараняў і аднаўляў гістарычную спадчыну Віцебска.

## Раскопкі экскаватарам

Протаіерэй Віцебскай епархіі Уладзімір Разановіч апавёў, што косткі кожны дзень збіраюць прыхаджане: у куце будпляцоўкі, з левага боку Успенскага сабора, будзе зробленая супольная магіла, дзе парэшткі знойдуць супакой. На пытанне, чаму мы не бачылі, каб хто збіраў, айцец заўважыў, што, магчыма, у панядзелак якраз быў выходны.

Супрацоўніца Віцебскага абласнога краязнаўчага музея Наталля Юр'еўна, захавальніца археалагічнай калекцыі, паведаміла, што вакол сабора археалагічныя даследаванні не праводзяцца, бо... няма культурнага слою. І за ўсім ажыццяўляе нагляд археолаг Вольга Ляўко, якой у Мінск дасылаецца ўся інфармацыя.

## Цяга да сенсацый

Вольга Ляўко ў размове не адмовіла, хоць і адказвала на пытанні нервова. Наконт археалагічнага нагляду на Успенскай гары яна адзначыла, што на будоўлі «прысутнічае кампетэнтны гісторык Аляксей Белавусаў», да якога паступаюць сабраныя косткі. А ён іх лічыць і адсылае звесткі ў Мінск. А парэшткі перадаюцца ў епархію.

Яе адказ на пытанне, чые тыя косткі, быў адназначны: ля сабора былі могілкі. «У Цішкіна цяга да сенсацый, — пракаментавала В.Ляўко версію пра тое, што парэшткі належаць рэпрэсаваным. — Ён лічыць, што тут такая ж сітуацыя, як і ў Курапатах, што зусім не так», — кажа В.Ляўко.

Чые б ні былі тыя парэшткі, яны валяюцца пад каўшамі экскаватараў. А пляц без усякага даследавання спакойна заліваюць бетонам. Хутчэй зробіш — менш нагоды для пытанняў.

**Ганна Журавіна**





**Успенскі сабор**

Каменная ўніяцкая Успенская царква (першы ўспамін пра драўляную царкву Найсвяцейшай Багародзіцы на гэтым месцы датуецца XV ст.) і базыльянскі кляштар будаваліся ад 1743 па праекце Язэпа III Фантаны. На загад расійскага імператара Паўла I у 1799 храм перайшоў да праваслаўных і быў перайменаваны ва Успенскі сабор.

За савецкім часам закрыты. У 1936 узарваны. У 1949 на месцы сабора пабудавалі цэх завода заточных станкоў, які быў закінуты ў 1980–я і знесены. Ад 1998 ідзе аднаўленне сабора.

**Узгорскі замак**

(мясцовая назва Успенская, або Лысая гара) ляжыць на ўзвышшы між Дзвіной і Віцьбай (на правым беразе). Людзі тут сяліліся з пачатку тысячагоддзя. У XIV—XV ст. на Узгор'і пабудаваныя Успенская, Уваскрасенская, Увядзенская цэрквы. У к. XVI ст. сюды перанесены гандлёва–эканамічны цэнтр Віцебска. Тут паўсталі ратуша, гасціны двор, крамы, паўднёвая частка Узгор'я абнесеная драўлянымі сценамі. Паводле інвентароў 1641, 1664, гэты ўчастак вядомы як Узгорскі замак. Быў умацаваны 10 вежамі, злучаўся з Ніжнім замкам мостам цераз Віцьбу.

## Сцісла

• **Нацбанк утрымае курс рубля да канца году ў межах плюс-мінус два працэнты, заявіў Пётр Пракаповіч.** Золатавалютныя рэзервы апошнія месяцы зніжаюцца, але ўрад рыхтуе прыватызацыю «Беларуськалія», якая іх папоўніць.

• **Мінгарвыканкам ізноў падаў у суд на прадпрыемства Някляева.** Мінгарвыканкам настойвае на неабходнасці ліквідацыі рэгістрацыі «Руху наперад» праз тое, што плошчы, якія займае ўстанова, з'яўляюцца гандлёвымі, і «Рух наперад» не можа іх выкарыстоўваць. 7 ліпеня Мінгарвыканкам ужо прайграў адну судовую справу «Руху наперад», які з'яўляецца заснавальнікам грамадзянскай кампаніі «Гавары праўду». На тым судзе прадстаўніца гарадскіх уладаў Эмілія Пазняк настойвала на неабходнасці ліквідацыі рэгістрацыі «Руху наперад» у сувязі з падачай няпраўдзівых звестак падчас рэгістрацыі. Аднак суддзя А.Аляшкевіч палічыў прэтэнзіі Мінгарвыканкама неабгрунтаванымі.

• **Дарогі і надалей будуць рамантаваць «ямачным» метадам.** На больш якасны грошай не хапае, сцвярджаюць у «Белаўтадары». З 15 тысяч кіламетраў дарог 85% маюць пратэрмінаваны рамонтны тэрмін, прычым 30% патрабуюць тэрміновага рамонту. Для папаўнення фондаў «Белаўтадар» прапануе аднавіць Дарожны фонд, які будзе папаўняцца ў два спосабы: увядзенне акцызу на бензін, а таксама платны праезд на аўтатрасах, які закране толькі грузавыя аўто, цяжэйшыя за 12,5 тон.

• **Рэкорд па колькасці тапельцаў за 30 гадоў.** Ад 12 да 18 ліпеня ў Беларусі патанула 145 чалавек, у тым ліку восем дзяцей. Прычынай амаль усіх здарэнняў стала парушэнне правілаў паводзінаў на вадзе. Большасць плавала выпіўшы. Да вады людзей цягне надзвычайная спякота. 22—23 ліпеня ў Беларусі чакаецца тэмпература паветра ноччу 17—24°C, днём 29—34°C, па паўднёвым усходзе 35—36°C.

• **Дажынкі-2011 пройдуць у Маладзечне.** Гэта было вырашана падчас рабочай сустрэчы кіраўніка Беларусі Аляксандра Лукашэнкі са старшынём Мінскага аблвыканкама Барысам Батурам. Сёлета «Дажынкі» пройдуць у Лідзе.

**АП, ЮУ, БелаПАН**

## Самае чытанае на nn.by за 14—20 ліпеня

- «Хросны Бацька — 2»
- Грунвальдская бітва ў Мінску: 70 затрыманых
- Праграма «Час» расказала пра Лукашэнку і забойствы
- Тэлеканал «Расія»: Палітычны хамелеон Лукашэнка сыдзе бясслаўна
- Кіргізскі сцэнар для беларускага хамелеона: наступныя крокі
- Мілінкевіч у даспехах у Грунвальдзе
- На каго ў Беларусі можа абаперціся Расія?
- Адносіны між Лукашэнкам і Крамлём выйшлі на ўзровень пагрозаў смерцю
- Грунвальд. Правакацыя Вітаўта
- Кіргізскі сцэнар: ці будуць у Мінску страляць?

## nn@nn.by

«У берасцейскіх шапіках «Белсаюздруку» не стала «НН». Прадавачкі паведамляюць, што апошнія 2-3 нумары проста не прыходзілі. Што здарылася? З павагай, Максім»

**Рэд.:** Максіме, будзем разбірацца, дзякуй. Магчыма, гэта водгулле канфіскацыі №25 з матэрыяламі пра фільм «Хросны Бацька». Сігналізуйце ў кожным такім наступным выпадку. А на газету найлепш падпісвайцеся праз Рэдакцыю.


# Не ўсё ў жыцці апошні раз!

## Падпіска праз Рэдакцыю

Цана падпіскі праз Рэдакцыю на месяц складае 7500 рублёў.

Мы рэкамендуем падпісвацца праз Рэдакцыю.

Наша сістэма дастаўкі газеты за 3 гады даказала сваю надзейнасць. Мы зможам дастаўляць Вам газету хутчэй або з той жа хуткасцю, што «Белпошта».

Каб штотыдзень атрымліваць газету, дасылайце адрасы і грошы за газету.

1) Просім усіх ахвотных падпісацца паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз: тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Мінск, а/с 537.

2) Просім у бланку банкаўскага паведамлення ці паштовага пераказу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езда.

**Банкаўскія рэквізіты (змяніліся з 1 мая):**

ПВУП «Суродзічы», УНП 190 786 828

Аддз. № 539 ААТ «Белінвестбанк», вул. Калектарная, 11, Мінск, код 739

Рахунак атрымальніка: 3012 740 628 011

Від аплаты: За газету «Наша Ніва»

## Падпіска праз «Белпошту»

Цана гэтай падпіскі — 8 520 руб. на месяц.

Падпісныя індэксы ў каталогу «Белпошты»: для людзей — 63125, для прадпрыемстваў — 631252. Падпісацца можна на кожнай пошце.

## Дзякуй падпісчыкам, якія падпісваюцца праз Рэдакцыю

С.А., Францу К. з Полацка.
Івану С. з Дзятлаўскага раёна.
Анатолю І. з Чэрвенскага раёна.
Мікалаю Ш., Аляксандру К., Мікалаю Ч. з Полацкага раёна.
Сяргею К. з Пінскага раёна.
Вячаславу В., С.К. з Маладзечанскага раёна.
Міхаілу Т. са Слуцкага раёна.
В.К., А.Р., Т.К., Уладзіміру М., А.П. са Смалявіцкага раёна.

# «Гавары праўду!» накручвае наведвальнасць сайта?




Кампанія купляе кантэкставую рэкламу ў расійскіх сістэмах.

Інфармацыя пра сайт кампаніі з'яўляецца ў сетцы расійскай сістэмы begun.ru. У аб'явах на расійскай мове прапаноўваецца даведацца праўду пра беспрацоўе ў Мінску.

Выкарыстанне падобнай сістэмы амаль не дае новых наведнікаў. Па «кантэкставай рэкламе» вельмі мала хто пераходзіць. Але яна дазваляе істотна павялічыць статыстыку праглядаў старонак сайта. Прылада дзейнічае такім чынам, што кожнае з'яўленне загалоўка на сайце, дзе круціцца рэклама, залічваецца ў наведвальнасць сайта zapraudu.info, нават калі па спасылцы ніхто не пераходзіў.

Такая рэклама выкарыстоўваецца, каб накруціць наведвальнасць сайтаў на паперы. Для справаздачнасці — дадае мёртвыя душы ў рэйтынгавую статыстыку.

Расійскі сэрвіс «Бегун» займаецца размяшчэннем кантэкставай рэкламы ў інтэрнэце па ключавых словах на абсягах Расіі ды СНД. На беларускім рынку інтэрнэт-рэкламы афіцыйна прадстаўленая кампаніямі Yandex, Google, «Бегун». Паводле інфармацыі Аляксея Захарэўскага, дырэктара кампаніі прасоўвання сайтаў Artox media (лацінск.), у Беларусі найбольш папулярная кантэкставая рэклама ў сістэме «Яндэкс. Дырэкт». Ёю карыстаюцца 90% кліентаў Artox media, толькі 10% — Google AdWords. «Бегун» не карыстаецца сярод беларусаў асаблівым попытам.

Кантэкставай называецца рэклама ў інтэрнэце, змест якой залежыць ад паводзінаў або месцазнаходжання карыстальніка. Сёння гэта найбольш эфектыўны і выгадны рэкламны інструмент у інтэрнэце.

На момант здачы матэрыялу ў друк нам не ўдалося атрымаць каментары ў прэс-службы кампаніі.

**Юльян Місюкевіч**

## Сцісла

• **Лукашэнка: Фюле не кранаў дэмакратызацыі і іншых смярдзючых пытанняў.** Еўракамісара Штэфана Фюле, які знаходзіўся ў Мінску 8–9 ліпеня, Лукашэнка назваў «прагматычным» і, на яго думку, «прыстойным чалавекам».

• **Падатковая патрабуе ад Дзмітрука 6 тысяч даляраў.** Сустаршыні БХД падатковая інспекцыя выставіла рахунак на выплату штрафу ў памеры 18 мільёнаў рублёў за нібыта перавагу расходаў шматдзетнай сям'і бізнэсоўцы над яго даходамі за апошнія дзесяць гадоў.

• **Беларусь наведае Башар Асад.** Падчас візіту прэзідэнта Сірыі плануецца разгледзець увесь спектр беларуска-сірыйскіх адносін. У чэрвені Сірыю наведаў міністр замежных справаў Беларусі Сяргей Мартынаў, які правёў перамовы з Башарам Асадам.

• **Невядомыя прыкруцілі чужы нумар да машыны Алеся Міхалевіча.** Па словах палітыка, яму не ўдалося даведацца, каму ж належаў чужы нумар, — акурат у гэты час у міліцыянтаў «завісла» кампутарная база дадзеных па аўтамабільных нумарах.

**ЗП**




16 ліпеня. Мінск.

## Асіпенку і Казлова могуць вызваліць па амністыі

Мікалай Аўтуховіч пад амністыю не трапляе.

«Асіпенка рыхтуецца выйсці. Іх збіралі, тых, каго будуць выпускаць. Але калі дакладна — залежыць ад адміністрацыі. Гэтыя звесткі я атрымала ад дачкі Асіпенкі Людмілы, якой ён даслаў ліст. Яна спадзяецца, што тата хутка будзе на волі», — кажа адвакат Асіпенкі Тамара Сідарэнка.

Уладзімір Асіпенка быў асуджаны на тры гады зняволення за захоўванне і перавозку зброі і выбухоўкі. Адбываць пакаранне Асіпенку накіравалі ў калонію «Воўчыя Норы» ў Івацэвічах. Туды ж найбліжэйшым часам хочуць накіраваць і Мікалая Аўтуховіча.

А вось былы міліцыянт Міхаіл Казлоў, якога абвінавацілі ў неданясенні на дзеянні Аўтуховіча, адбывае зняволенне ў турме «Віцьба», дзе некалі сядзеў Аляксандр Казулін.

Адвакат Казлова Барыс Ляскоўскі ўпэўнены, што ягоны падабаронны выйдзе на волю не пазней за 8 жніўня.

А вось да Мікалая Аўтуховіча амністыя прымененая не будзе, бо ён асуджаны за злачынства, якое здзейсніў, не адбыўшы яшчэ папярэдняга пакарання. На мінулым тыдні Аўтуховіча пад канвоем вазілі да стаматолага.

**Зміцер Панкавец**

## «Я трымаю дзве каровы, тры быкі, пчол. Выжыву!»

Настаўніка нямецкай мовы Георгія Станкевіча з-пад Бешанковіч звольнілі за палітыку.

**«НН»: Як здарылася, што Вы страцілі працу?**

**Георгій Станкевіч:** Апошнія 14 гадоў я працаваў настаўнікам замежнай мовы ў сельскай школе, Пяцігарскай сярэдняй. Гэта 15 кіламетраў ад маёй хаты. Нямецкая мова была маім хобі. А калі хобі становіцца працай, то ты самы шчаслівы чалавек.



**Настаўнік нямецкай мовы Георгій Станкевіч**

мае дзве вышэйшыя адукацыі: агранома і выкладчыка замежных моваў. У 2006 быў другім у раённым конкурсе «Настаўнік году», у 2007 яму ўручылі грамату за добрую працу, у 2008 і 2009 кіраўніцтва адзначыла яго дасягненні ў спартовым выхаванні вучняў. У 2010 звольнілі.

Летась, пры канцы навучальнага году, да нас прынеслі надрукаваныя кантракты. Кожнаму настаўніку працягнулі на пяць гадоў, а мне — толькі на год. Я адразу зрабіў вывад, што гэта ад маёй палітычнай дзейнасці. Я ж раней збіраў подпісы за Мілінкевіча, арганізоўваў сустрэчы з Арловым. Мяне хочуць прыструніць, сказаць: не нарывайся і г.д. А я высноваў не зрабіў і паводзіў сябе так, як лічыў патрэбным. Удзельнічаў у мясцовых выбарах, сустракаўся з людзьмі. Тады выбарчая камісія забараніла трансляваць мой зварот да выбарцаў праз мясцовае радыё. Прагучала прамова толькі ў апошні дзень перад выбарамі, пасля адпаведнага дазволу з боку Лідзіі Ярмошынай.

Вынік: сёлета я стаю на рынку, прадаю бульбу, і да мяне падыходзіць дырэктарка школы з паперкай на подпіс: «у сувязі з заканчэннем кантракту з 31 жніўня вы застаецеся без працы». Хай будзе так. Я падпісаў і аддаў кантракт.

**«НН»: Яна патлумачыла, чаму кантракт не працягнулі?**

**ГС:** Карэспандэнтка Радыё «Свабода» званіла ў аддзел адукацыі. Загадчык аддзела адукацыі Іван Жарабцоў сказаў, што мне дадуць працу бліжэй да майго дому. Я гэта чуў упершыню. Пакуль на яго не наехалі карэспандэнты, такога ніхто не казаў. Зрэшты, раней ён казаў, што пакуль сам сядзіць на пасадзе, дык і Станкевіч будзе на сваёй. Мабыць, яго моцна прыціснулі зверху.

**«НН»: Калі паверыць, што ён сказаў праўду, ці ёсць такія месцы працы, бліжэйшыя да дому?**

**ГС:** Найбліжэйшая школа — у суседняй вёсцы Верхняе Крывіна, за 1,5 кіламетра. Але там няма нямецкай мовы, гэта ж пачатковая школа. Я чуў, што яе хутка закрываюць. Яшчэ адна школа ёсць непадалёк, 9-гадовая. Я там падмяняў сёлета адзін дзень, там 24 чалавекі ўсяго. Здаецца, і яе таксама зачыняць праз год. Яшчэ адзін варыянт — у гімназію, але там нямецкай мовы амаль няма. Нямецкая ёсць толькі ў тых дзетак, якія вучылі яе раней і трапілі ў гімназію ў 8-11 класах.

**«НН»: Вам хацелася б вярнуцца ў школу настаўнічаць?**

**ГС:** Хацелася б! Я ж павышаю кваліфікацыю, бываю ў Нямеччыне, гляджу нямецкамоўныя каналы па тэлебачанні, чытаю нямецкія кніжкі ў арыгінале.

**«НН»: Як вы зараз жыць будзеце без заробку?**

**ГС:** Заробак у мяне ёсць стабільны — мая гаспадарка. Я трымаю дзве каровы, тры быкі, курэй, гусей, саджу бульбу, маю пчолы. Я ведаў, што ў любы дзень магу застацца беспрацоўным, таму забяспечыў сабе тылы. Але гэта ўчорашні дзень, толькі дзеля таго каб выжыць...

**«НН»: У калгас не вернецеся па першай спецыяльнасці, аграномам?**

**ГС:** Не. У калгас я мог бы вярнуцца, каб не пабываў у Нямеччыне. Я пабачыў, што значыць праца для сябе. Калгас нішчыць чалавека як асобу. Нельга ў калгасе нічога зрабіць у плане эканамічных паказчыкаў. Вось прыклад: раніцай механізатары бяруць пуцёўкі, каб ехаць на працу, праз паўгадзіны пачынаецца дождж. Гэтая праца становіцца шкоднай, бо змяніліся кліматычныя ўмовы. Ніхто не вернецца назад. Усе будуць далей рабіць непатрэбную працу, нішчыць тэхніку, паліць сродкі. Калгас аджыў сваё.

**«НН»: А з палітыкай завяжаце?**

**ГС:** Не, буду зноў збіраць подпісы за Мілінкевіча ці за іншага нацыянальнага кандыдата, калі будзе не Мілінкевіч.

**«НН»: Зараз так выйдзе, што Вы будзеце жыць за жончын заробак. Як яна да гэтага ставіцца? З хаты не пагоніць?**

**ГС:** За жончын заробак я не буду жыць ніяк, ён мізэрны. Яна атрымлівае ў прыёмным пакоі бальніцы каля 300 тыс. бел. рублёў за поўную стаўку. Асноўны прыбытак будзе даваць хатняя гаспадарка. Мы маем амаль паўмільёна толькі за малако. Па восені нешта прынясуць пчолы, нешта быкі дадуць, бульба свая. Выжывем.

Па-другое, у мяне з'явіцца шмат вольнага часу. Я практычна ва ўсіх школах выступаў з канцэртамі ўжо. У дзесяці месцах забароняць, а дзесяці дазволяць. Трэба будзіць народ, паказваць, што ёсць іншая Беларусь. Тая Беларусь, якая павінна быць на нашай зямлі, а не тая, якую нам навязваюць сённяшнія кіраўнікі.

**Настасся Шамрэй**

# Даражэйшае, затое не расійскае

Венесуэльская нафта каштуе трохі даражэй за расійскую, але эканамічная незалежнасць таго вартая.

Нарэшце грамадскасць атрымала адказ на інтрыгоўнае пытанне: колькі каштуе венесуэльская нафта для Беларусі. Пад прыкрыццём камерцыйнай таямніцы гэтая інфармацыя хавалася больш за тры месяцы.

«Краіна купляе нафту ў Венесуэле па добрай цане. Калі купляць расійскую нафту са стопрацэнтнымі мытамі, Беларусь нясе страты, а на венесуэльскай нафце — выйграе. На нафце, якую мы прывезлі з Венесуэлы, мы зарабілі. Гэта плюс, а не мінус», — казаў два тыдні таму першы віцэ-прэм'ер Беларусі Уладзімір Сямашка.

Высокі чыноўнік недагаворваў, а амбасадар Венесуэлы Амерыка Дыяс Нуньес дадаваў інтрыгі: «Кошт нафты — камерцыйная таямніца, якая калі-небудзь стане вядомай».

### Венесуэльская якасць

Адказ на пытанне нааконт цэн дадзены Нацыянальным статыстычным камітэтам Беларусі. Па ягоных падліках, краіна ў маі 2010 імпартавала 79,8 тысяч тон нафты з краін далёкага замежжа. Гаворка вядзецца пра першы танкер з Венесуэлы, бо нафта з яго даехала да нашай краіны менавіта ў маі.

У той жа час увесь венесуэльскі імпарт склаў $52,5 мільёны. Калі нічога, апроч нафты, Беларусь у Чавеса не купляла, выходзіць, што тона каштавала $656. Такі факт цалкам імаверны, бо, напрыклад, у 2009 венесуэльскі імпарт быў нулявым. Тамy кава ці бананы, якія патэнцыйна наша краіна можа закупаць у Лацінскай Амерыцы, ніякім чынам не псуюць статыстыку.

Хутчэй за ўсё, у цану ўжо ўключаны кошт дастаўкі венесуэльскага паліва ў Беларусь. Шлях ад Каракаса да Мазыра дадаў да кожнай тоны нафты каля $90. Значыць, чыстая нафта ў Венесуэле была купленая за $560.

Нятанна, але паліва «Санта-Барбара», якое пастаўляецца ў Беларусь, — добрай якасці. У параўнанні з расійскім палівам, з венесуэльскага атрымаецца больш нафтапрадуктаў.

### Расійская эканомія

А што ж з коштам расійскай нафты? Пачнем падлікі. Усяго Беларусь мае патрэбу ў 20 мільёнах тон нафты штогод. З іх Расія пастаўляе 6,3 мільёна тон бязмытна. Сярэдняя цана бязмытнай расійскай нафты летась складала $256 за тону. Сёлета гэтая цана трохі падрасла ў сувязі з агульным ростам цэнаў на нафту.

Памер экспартных мытаў у Расіі мяняўся — на працягу першага паўгоддзя яны складалі $267—292 за тону. З 1 ліпеня мыта зніжана да $248 за тону.

Такім чынам, агульны кошт 20 мільёнаў тон «чорнага золата» за год складзе каля $9 мільярдаў. У сярэднім кожная тона — $450. У тым ліку цана нафты з мытамі — каля 550—600 даляраў. Хоць якасць паліва горшая за венесуэльскую, але і эканомія відавочная.

### Іранская перспектыва

Апроч лідэра Венесуэлы Уга Чавеса працягнуць руку дапамогі кіраўніку Беларусі гатовы і прэзідэнт Ірана Махмуд Ахмадзінежад. «Будзе асобны праект, акрамя здабычы нафтавай сыравіны з радовішча Джафейр», — заявіў беларускі пасол у Іране Віктар Рыбак. Па яго словах, ужо хутка беларускія спецыялісты пачнуць абмяркоўваць з іранскім бокам пытанні аб эканамічнай эфектыўнасці такіх паставак.

Нядаўнія заявы віцэ-прэм'ера Уладзіміра Сямашкі сведчаць пра тое, што ўжо ў кастрычніку гэтага году Беларусь пачне прамысловую здабычу нафты ў Іране і будзе ў далейшым штогод здабываць 1,5 мільёна тон «чорнага золата».

Цалкам верагодна, што Беларусь будзе разлічвацца з Іранам за нафту не толькі грашыма, але і прадукцыяй сваёй прамысловасці. «Разам з прадукцыяй нафтахімічнага комплексу ільвіную долю экспарту склалі акрылавыя валокны, пайшлі пастаўкі кар'ерных самазвалаў», — заявіў беларускі пасол. Таксама, па яго словах, «вядзецца сур'ёзная праца па пастаўках металапрадукцыі». І ўжо сёлета ў Іране запрацуе вытворчасць па зборцы грузавікоў Мінскага аўтазавода.

### Балтыйская дапамога

Беларусь тым часам шукае альтэрнатыву пастаўкам нафты праз украінскую чыгунку. Каб нагрузіць працай наваполацкі «Нафтан», улада спрабуе дамовіцца з краінамі Балтыі. Ужо ў гэтай дэкадзе танкер з венесуэльскай нафтай прыедзе ў эстонскі порт Мууга. Ад яго да Наваполацка нават бліжэй, чым ад Адэсы да Мазыра.

Уключыўшы ў лагістыку яшчэ і Эстонію, Беларусь не адмаўляецца ад супрацоўніцтва з Літвой, Латвіяй і Польшчай, якія маюць свой выхад да Балтыйскага мора. Кошт транспартавання застанецца прыблізна такім самым, але дыверсіфікацыя — магчымасць выбару паміж некалькімі партнёрамі — развяжа рукі Беларусі. Раней краіна татальна залежала ад паставак вуглевародаў з Расіі. Паводле стандартаў ЕС, краіна не павінная атрымліваць ад аднаго пастаўшчыка больш за трацiну аб'ёму спажываных энерганосьбітаў.

Доля венесуэльскага прадукту пакуль што мінімальная. Але зробленая хаця б заяўка на альтэрнатыву Расіі.

**Яўген Васількоў**



PHOTO BYMEDIA.NET

«Уся нафта — і венесуэльская, і расійская — сцякаецца ў Мазыр».

**Прыбытак падзеляць**

Тыдзень таму Беларусь і Венесуэла стварылі сумеснае прадпрыемства «Петройл ВБ С.А.». Кампанія будзе займацца пастаўкамі венесуэльскай нафты ў Беларусь. Нашай краіне будзе належаць усяго 25% прадпрыемства, Венесуэле — 75%. Такім чынам будзе размяркоўвацца і прыбытак ад перапрацаванай нафты. Раней пастаўкі арганізоўвала Беларуская нафтавая кампанія, але і прыбытак ішоў выключна ў кішэню Беларусі.

## Аўтадылеры гатовыя мяняць старыя аўто на новыя

з даплатай ад кліента.

Яны заклікаюць урад падтрымаць іх ініцыятыву.

Беларускія аўтадылеры зацікаўленыя развіваць у Беларусі сістэму trade-in. Гэта паслуга па абмене старога аўтамабіля на новы з даплатай. Беларуская аўтамабільная асацыяцыя (БАА) ужо звярнулася з адпаведнай прапановай да ўрада.

Паводле цяперашніх правілаў, аўтадылеры павінныя пры фармаванні цаны продажу ўлічваць ПДВ, што прыводзіць да падаражання аўтамабіля на 20%. А вось фізічныя асобы ад такога падатку вызваленыя, што дае ім перавагу. Беларуская аўтамабільная асацыяцыя прапануе выплачваць падатак толькі з кошту, які дадаецца пры перапродажы. Такая схема працуе ў Расіі ўжо год.

Паводле падлікаў, штогод ад 600 да 800 тысяч аўтамабіляў мяняюць уласніка, але ў пераважнай большасці выпадкаў падаткі з гэтых сум не выплачваюцца.

Для кліента ж асноўным плюсам, на думку Беларускай аўтамабільнай асацыяцыі, будзе гарантыя. Аўтадылеры павінны будуць выконваць закон аб абароне правоў спажыўцоў, у той час як пры куплі машыны з рук усе выяўленыя недахопы давядзецца выпраўляць новаму ўласніку самастойна.

Па ацэнках экспертаў, у Еўропе каля 50% аўтамабіляў прадаецца з выкарыстаннем сістэмы trade-in.

**ЯВ, naviny.by**

### Сцісла

• **Маладым спецыялістам сяла штомесяц будуць даплачваць па 180 тысяч.** Урад Беларусі ў тры разы павялічыў памер надбаўкі моладзі, якая паехала працаваць на сяло. Грошы будуць выплачвацца на працягу трох гадоў працы. Цяпер агульны памер даплаты складзе 270 тысяч рублёў.

• **Прыватызацыя ТБ, ЖКГ і тэлекамунікацый?** Комплексны план мерапрыемстваў на 2010 па ўдасканаленні інвестыцыйнага клімату ў Беларусі прадугледжвае рэфармаванне дзяржаўных манаполій. Разам з тым узмоцніцца паўнамоцтвы антыманапольнага камітэта.

• **Пачалося жніво.** Збожжа скасілі на 5,1% плошчы. Першымі стартавалі на Гомельшчыне і Берасцейшчыне.

• **Пасябравалі з Грузіяй.** Каўказцы гатовыя купляць беларускія ліфты і хуткасныя цягнікі.

• **За першае паўгоддзе ВУП вырас на 6,6%.** Вырас і аб'ём замежнага гандлю. Ён павялічыўся на 19,9%, пры гэтым экспарт павялічыўся на 27%, а імпарт — толькі на 14%. Гэта сведчыць пра тое, што Беларусь пакрысе выраўноўвае свой замежнагандлёвы баланс. Інфляцыя ў першым паўгоддзі склала 4,1%.

• **У Беларусь прыйшоў «Расдзяржстрах».** Адна з найбуйнейшых кампаній Расіі знаходзіцца ў стадыі афармлення бізнэсу ў нашай краіне.

• **«Дажынкі» прыйдуць у Маладзечна.** Менавіта ў гэтым горадзе Мінскай вобласці адбудзецца «свята працаўнікоў сяла»—2011. Сёлета «Дажынкі» праводзяцца ў Лідзе і Лідскім раёне.

**ЯВ**

### Удакладненне

У №26 «НН» было памылкова напісана, што Кіраўніцтва справаў прэзідэнта ўзначальвае Мікалай Корбут, былы міністр фінансаў. Корбут-«заггасп» — проста поўны цёзка былога міністра. Перапрашаем.

# Лядовы палац збудуюць і ў 15-тысячным Драгічыне

Гэта будзе 24-ы лядовы палац у краіне.

Як расказаў начальнік аддзела архітэктуры і будаўніцтва Драгічынскага раёна Дзмітры Хаванскі, лядовы палац пабудуюць па праекце пружанскага. Новы палац размесціцца недалёка ад цэнтра, каля паліклінікі, паміж вуліцамі 9 Мая і Маркса.

Усе будынкі комплексу будуць займаць тэрыторыю 2,5 га разам з пласкаснымі забудовамі — пляцоўкамі ды стадыёнамі. У 2010 будзе распрацаваны праект. Калі распрацоўка завершыцца, можна будзе ацаніць агульны бюджэт. Будаваць палац плануюць у 2011—2012.

Некаторыя жыхары раёна абураныя ідэяй уладаў. У школе вёскі Імянін даўно збіраліся будаваць спартыўную залу. Цяпер стала вядома, што тыя грошы пойдуць на лядовы палац у раённы цэнтр.

«У нас заняткі фізкультуры адбываюцца на вуліцы, — дзеліцца думкамі мясцовая настаўніца. — Як дождж ці зіма — у калідорах ці класах, настаўнікі выкручваюцца як могуць. Навошта ў малым горадзе лядовы палац? Там усе школы са спартзаламі, якіх у сельскіх раёнах бракуе».

Драгічын — райцэнтр у Берасцейскай вобласці з насельніцтвам у 15 тысяч чалавек.

Усяго ў Беларусі цяпер 23 лядовыя палацы.

**Юльян Місюкевіч**



**Новы палац пабудуюць па праекце пружанскага.**

# Курэйчык падазрае Латушку

Звольненага за інтэрв'ю апазіцыйным СМІ драматурга аднавілі на працы ва Універсітэце культуры.

«Не ведаю, хто менавіта прымаў рашэнне аб маім аднаўленні, — адзначае Андрэй Курэйчык. — Мне тэлефанавалі з Адміністрацыі прэзідэнта і Міністэрства культуры, прапаноўвалі дапамогу. Думаю, вялікую ролю адыграў міністр культуры Павел Латушка. Акрамя гэтага, была сустрэча з кіраўніком Офіса АБСЕ ў Мінску Бенедыктам Халерам. Ва ўсіх выпадках адчувалася зацікаўленасць вырашыць праблему».

Курэйчыка звольнілі з універсітэта месяц таму. Драматург даў інтэрв'ю выданням «Салідарнасць» і «Народная воля», у якіх абурыўся ператрусамі актывістаў кампаніі «Гавары праўду» і падтрымаў Уладзіміра Някляева. Пасля тых публікацый, па словах Курэйчыка, ва ўніверсітэт прыйшоў загад не працягваць з ім кантракт. У знак пратэсту Курэйчык адмовіўся прымаць экзамены ў студэнтаў.

Чаму ж рашэнне было зменена? «Магчыма, нехта палічыў, што для іміджу краіны скандал з палітычным звальненнем цяпер не патрэбны. Не думаю, што гэта прывядзе да якіх-небудзь кантактаў з дзяржавай, проста мне дазволяць далей выкладаць у маіх студэнтаў», — кажа спадар Курэйчык.

**Сяргей Макарэвіч**



**Андрэй Курэйчык**

нар. 1980 у Мінску. Драматург, кінасцэнарыст, акцёр. Аўтар п'ес «П'емонцкі звер», «Понцій Пілат», «Пане Каханку», сцэнароў да камедый «Любовь-морковь», «Любовь-морковь-2», «Юленька».

# Віншаваць з 27 Ліпеня будуць аднагодкі Незалежнасці

Аргкамітэт па святкаванні 20-годдзя прыняцця Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце запланаваў вулічную акцыю.

З такой ініцыятывай выступіла Беларуская Хрысціянская Дэмакратыя. Да яе далучыліся «Малады Фронт», Правы Альянс, Рух салідарнасці «Разам».

У суботу, 24 ліпеня, а 12-й на мінскай сядзібе БНФ пачнецца навукова-практычная канферэнцыя, у якой возьмуць удзел дэпутаты Вярхоўнага Савета, якія прымалі Дэкларацыю. Будуць запрошаныя і навукоўцы.

Зранку 27 ліпеня ўшануюць памяць памерлых удзельнікаў руху за незалежнасць – такіх як Генадзь Карпенка, Яўген Кулік. Людзі наведаюць у гэты дзень Паўночныя, Усходнія і Кальварыйскія могілкі.

На вечар запланаваны абыход плошчаў з ускладаннем кветак.

На думку арганізатараў, на дваццатую гадавіну абвяшчэння незалежнасці будзе вельмі сімвалічна, калі сярод удзельнікаў вулічнай акцыі будуць дваццацігадовыя дзяўчаты і хлопцы ў бел-чырвона-белай вопратцы.

Вулічнае мерапрыемства пачнецца а 18-й на плошчы Якуба Коласа. Удзельнікі рушаць да сквера Янкі Купалы і помніка Багдановічу.

Як галоўнае нацыянальнае свята 27 ліпеня адзначалася ад 1991 да 1996 году. Перанос Дня незалежнасці на 3 ліпеня, дзень вызвалення Мінска ад фашыстаў, адбыўся па волі Лукашэнкі.

У другой палове 90-х апазіцыя працягвала адзначаць 27 ліпеня як Дзень незалежнасці. Цяпер арганізатары маюць намер вярнуць старыя традыцыі.

Прыняцце Дэкларацыі азначала падрыхтоўку да выхаду Беларусі з Савецкага Саюза. Як толькі склаліся спрыяльныя ўмовы, 25 жніўня 1991 Дэкларацыя набыла статус канстытуцыйнага закону.

**Юльян Місюкевіч**

# Беларусы — самыя шчаслівыя сярод суседзяў

Але найшчаслівейшыя жывуць у Скандынавіі.

Паводле звестак сусветнага апытання сацыялагічнай службы Gallup-а, лідэр рэйтынгу шчаслівых краін — Данія. У пяцёрку самых намысных увазходзяць таксама Фінляндыя, Нарвегія, Швецыя, Нідэрланды.

Як піша часопіс Forbes, усе гэтыя краіны заможныя, што дазваляе выказаць здагадку пра сувязь паміж задаволенасцю жыццём і грашыма.

У Даніі «жывуць цудоўна» 82% рэспандэнтаў, 17% маюць праблемы, і толькі 1% прызналіся, што пакутуюць.

Беларусь у гэтым рэйтынгу займае 54-е месца, Польшча — 56, Літва — 63, Расія — 73, Эстонія — 90, Латвія — 110.

Самыя няшчасныя — у Бурундзі, на Каморскіх астравах і ў Тога.

**ЗП**



PHOTO.BYMEDIA.NET

**Беларусы маюць шчасце цешыцца тым, што маюць.**

# Кіраўніцтва БАТЭ: Сярод нашых фанатаў ёсць падонкі

Матч з «Хабнарф'ёрдзюрам» азмрочыў нацысцкі выбрык.

Першы матч другога кваліфікацыйнага раунда Лігі чэмпіёнаў адзначыўся выбрыкам беларускіх заўзятараў.

На трыбунах сярод іншых транспарантаў з'явіліся плакаты з лічбамі 14 і 88. Гэта кодавы лозунг сучасных фашыстаў (лічба 88 расшыфроўваецца як фашысцкае вітанне «Heil Hitler!», бо літара «H» — восьмая ў алфавіце).

Кіраўніцтва ФК БАТЭ адрэагавала яшчэ да таго як тэму паднялі СМІ. Пры гэтым у ацэнках Капскі і кампанія былі вельмі жорсткімі.

«Нейкія прыдуркаватыя такім вось брудным спосабам, вітаючы нацызм, вырашылі нанесці ўдар па іміджы клуба. Як ні сумна гэта прызнаваць, фанацкае асяроддзе нашага клуба, зрэшты, як і любога іншага, — неаднастайнае, і, як аказалася, у ім існуе група падонкаў, якія падзяляюць нацысцкую філасофію. ФК БАТЭ ўжо пачаў уласнае расследаванне. Вядуцца кансультацыі з лідэрамі фанацкага руху, рыхтуецца зварот у праваахоўныя органы. Не сумняемся, выканаўцы гэтай брыдкай акцыі будуць выяўленыя», — гаворыцца ў заяве БАТЭ.

Гэта не першы падобны выпадак сёлета ў нашым футболе. У красавіку фанаты мінскага «Дынама» вывесілі банер, які ўсхваляў нацыста Рудольфа Геса.

«Дынамаўцы» атрымалі за гэты выбрык фанатаў 245 мільёнаў штрафу.

Рэакцыя кіраўніцтва БАТЭ незвычайная тым, што клуб вырашыў пайсці на апярэджанне, пакуль не ўжытыя санкцыі.

Фанацкі асяродак — досыць уразлівы для розных радыкальных рухаў і груповак, прытулак самых адыёзных ідэй і поглядаў. І гэткая сітуацыя не толькі ў Беларусі, але ва ўсім свеце. Нездарма футбалісты часта выходзяць на поле з надпісамі супраць расізму ці нацызму.

Зрэшты, у беларускіх умовах спыніць такія выпадкі нескладана. Міліцыя перад гульнёй трасе ўсіх заўзятараў на наяўнасць забароненай нацыянальнай сімволікі. Пры гэтым закрывае вочы на фашысцкія выбрыкі хуліганаў.

Матч жа скончыўся перамогай нашай каманды — 5:1. Цяпер яна мае добрыя шанцы выйсці ў наступнае кола, дзе сыграе з дацкім «Капенгагенам».

**Зміцер Панкавец**

# Апякліся на свіным грыпе

Доктар адмовілася каментаваць анамальную спёку... без дазволу начальства.

Гомельскія журналісты Алег Ражкоў і Таццяна Бублікава звярнуліся па каментар у гарадскі шпіталь хуткай дапамогі. У прыёмным пакоі журналістаў накіравалі да адзінага прысутнага на той час начальніка — адказнага тэрапеўта бальніцы Вольгі Майсеенка. Доктарка забараніла рабіць здымкі ў бальнічным калідоры і адмовілася даць каментар.

Паводле словаў журналісткі, медык патлумачыла адмову неабходнасцю атрымаць дазвол начальства. І параіла журналістам звярнуцца да галоўурача альбо начмеда на наступны дзень.

«Мы прасілі даць простыя парады для людзей: як выжываць, калі на вуліцы амаль 35 градусаў», — цытуе Т.Бублікаву baj.by.

**Сяргей Мікулевіч**

# Грунвальдская бітва ў Мінску: 70 затрыманых

**Маразм: міліцыя ганяла моладзь, якая арганізавала бой падушкамі ў гонар юбілею Грунвальду.**

Вясёлая акцыя пачыналася нявесела. Андрэй Кім, зусім як Ягайла 600 гадоў таму, доўга не наважваўся даць свайму войску каманду. Ён вёў яго ад станцыі метро «Усход» углыб зялёнай зоны. Сталі на пагорку. Следам ішоў маёр міліцыі з мегафонам і паўтараў, што акцыя несанкцыянаваная. Кім спрабаваў дамовіцца з маёрам, але той усё паўтараў фразу пра несанкцыянаванасць...

Напярэдадні Мінгарвыканкам адмовіўся даць дазвол на бітву падушкамі ў гонар юбілею Грунвальду. Але арганізатары ўсё адно заклікалі моладзь прыходзіць увечары 15 ліпеня да Нацыянальнай бібліятэкі, дзе бітва мусіла адбыцца. Толькі мала хто здолеў туды прарвацца. Перахопліваць патэнцыйных удзельнікаў пачалі за гадзіну да пачатку, на выхадзе са станцыі метро «Усход». Міліцыянты правяралі заплечнікі і сумкі моладзі. На пытанне, навошта гэта робіцца, аджартоўваліся. Трохі бліжэй да Нацыяналкі стаялі супрацоўнікі ў цывільным, якія адводзілі ў амапаўскія аўтобусы тых, у каго былі выяўленыя падушкі. Калі ж каму ўдавалася пратачыцца праз кардоны ля метро і дайсці да Нацыяналкі, дык там сустракалі фізічна развітыя асобы ў цывільным. І зноў-такі праводзілі ў аўтобус.

Усяго за вечар у Першамайскі РУУС сталіцы, трапіла каля 70 ваяроў з падушкамі. У некаторых з іх бралі адбіткі пальцаў, іншых проста адпускалі.

Завадатар падушкавых баталій Андрэй Кім таксама не прайшоў да Нацыяналкі. Ён згуртаваў некалькі сотняў сваіх ваяроў ля метро «Усход», расказаў ім пра Грунвальдскую бітву, правёў конкурсы і раздаў сімпатычныя значкі — з выявай вершніка «Пагоні» з падушкай. Паралельна ішлі перамовы з міліцыяй. Але шарагоўцы грубілі, а начальства ўнікала размоваў з Кімам у прысутнасці журналістаў.

Урэшце натоўп рушыў ад метро ўглыб зялёнай зоны. Людзі раз-пораз спыняліся, выгукалі «Біцца!», пачыналі без каманды калашмаціць падушкамі найбліжэйшых суседзяў. Кім, зняверыўшыся ў магчымасці дамовіцца з маёрам, які адказваў праз мегафон, наважыўся пачаць акцыю. Авалодаў сітуацыяй, падзяліў удзельнікаў на войскі — па прынцыпе цотнасці-няцотнасці даты народзінаў, — і паляцела пер'е. Агулам у бітве ўдзельнічала 300—400 «ваяроў». Яшчэ сотня назірала. «Грунвальд» працягваўся хвілін дваццаць, пасля наляцела залева. Мокрыя «ліцвіны» ўперамешку з «крыжакамі» пабеглі да метро. Толькі некалькі дзясяткаў самых зацятых дзялілі поле. Аднак пасля дажджу падцягнуліся гледачы ў цывільным і ў форме ды пачалі вылоўліваць з натоўпу арганізатараў. Забралі і Андрэя Кіма.

Назаўтра яго судзілі за арганізацыю несанкцыянаванай акцыі і аштрафавалі на 17 500 рублёў. Ноч Кім правёў у РАУСе. Спаў, падклаўшы пад галаву падушку, якую ў яго так і не змаглі адабраць.

Наступная бітва падушкамі запланаваная на Дзень беларускай вайсковай славы — 8 верасня. Арганізатары збіраюцца дабівацца ад Мінгарвыканкама дазволу.

**Наста Шамрэй, Юльян Місюкевіч, фота Юліі Дарашкевіч**



**Андрэй Кім дабіваецца сустрэчы з афіцэрам міліцыі.**

Першая акцыя «Бой падушкамі», прымеркаваная 599–годдзя Грунвальдскай бітвы, прайшла ў Мінску без дазволу ўладаў 15 ліпеня 2009. Праз 2 месяцы, 8 верасня 2009, у гонар 495–годдзя Аршанскай бітвы адбылася другая ў гісторыі беларускага падушачнага руху санкцыянаваная акцыя. У другой бітве паўдзельнічала 400 чалавек.

**Каментар юрыста**

Адвакат Гары Паганяйла: Два чалавекі з узаемнай згоды маюць права біцца падушкамі там, дзе ім заманецца. І міліцыя неправамоцная разганяць.



**Моладзь з падушкамі ў міліцэйскім аўтобусе.**



**«Грунвальдская бітва».**

## Здарэнні сцісла

• **Арыштаваны намеснік дырэктара Гомельскага станкабудаўнічага завода.** Аператыўнікі звярнулі ўвагу, што адзін з кіраўнікоў прадпрыемства жыве не па сродках, у той час як завод знаходзіцца не ў найлепшым фінансавым становішчы. Намеснік дырэктара быў затрыманы па падазрэнні ў атрыманні 10 тысяч еўра ад сталічнага бізнэсоўца. Нібыта грошы былі атрыманыя за станоўчае вырашэнне пытання аб прадстаўленні ў арэнду вытворчага памяшкання прадпрыемства. Сталі вядомыя і іншыя факты. Яму прад'яўленае абвінавачанне ў атрыманні хабару.

• **У Мінску абрабавалі ювелірную краму.** 37-гадовы жыхар Чашнікаў, раней судзімы за хуліганства, пагражаючы нажом, разбіў у вітрыне шкло, забраў залатыя ювелірныя вырабы і ўцёк. Праз некалькі гадзін яго затрымаў нарад міліцыі. У яго канфіскавана 142 залатыя ювелірныя вырабы на суму 89 млн рублёў. Яму пагражае 15 гадоў турмы.

• **Знайшлі тры трупы бадзягаў.** Трупы без прыкметаў гвалтоўнай смерці знойдзеныя ў Мінску. Целы двух чалавек знойдзеныя на вуліцы ля падсобнага памяшкання, у якім яны жылі, яшчэ адзін памерлы знойдзены ў самой падсобцы. Вядома, што напярэдадні яны ўжывалі алкаголь. Яшчэ спецыялісты МНС выявілі ў паветры падвышанае ўтрыманне пароў сінільнай кіслаты.

• **У Крыме патануў малады беларус.** Яго цела знайшлі на дне мора за 50 метраў ад берагу. Хлопец 1986 году нараджэння прыехаў на курорт у Судак адзін і жыў у прыватным сектары. Паводле папярэдняй інфармацыі, падчас купання ў яго здарыўся прыступ эпілепсіі.

• **Пад Брэстам п'яны інспектар ДАІ раз'ехаў раварыста.** Міліцыянт кінуў 17-гадовага хлопца паміраць і паспрабаваў схавацца з месца здарэння. У яго крыві пазней знайшлі 1,1 праміле алкаголю. Хлопец, якога ён збіў, раніцай памёр у шпіталі ад чэрапна-мазгавой траўмы.

• **Самасуд над п'яным кіроўцам пад Гроднам.** На кар'ерах у Гожы (вёска непадалёк ад Гродна) адбылася гісторыя, у якой пацярпелі 5 аўтамабіляў (у адным з іх знаходзілася дзіця) і кіроўца, што ўчыніў аварыю. За рулём «Крайслера» сядзеў малады чалавек у стане алкагольнага ап'янення. «Крайслер» спачатку стукнуўся ў «Опель Астра», практычна вырваў пярэдняе правае кола, змяў крыло, разбіў фару і сарваў бампер, затым ударыў у «Кіа» і завяршыў рух аб бок «Пежо 406», штурхнуўшы яго на «Таёту Авенсіс», якая ад удару адскочыла на 40 сантыметраў. У момант таранаў у «Пежо» сядзела маленькая дзяўчынка. Кіроўца «Крайслера» спрабаваў пакінуць месца аварыі. Аднак два мужчыны разбілі яму твар у кроў, зламаўшы пры гэтым нос.

• **Міліцыянеры купілі 24 пляшкі рому, а потым арыштавалі прадаўца.** Супрацоўнікі сталічнай міліцыі выявілі нелегальнага прадаўца дарагога алкаголю, які гандляваў праз інтэрнэт. Для гэтага праваахоўнікі замовілі ў яго буйную партыю спіртнога. У выніку 20-гадовы беспрацоўны жыхар сталіцы быў затрыманы адразу ж пасля ўгоды. З салона яго аўтамашыны канфіскаваныя 24 бутэлькі рому, дзве тэкілы і бутэлька джыну. Агульны аб'ём безакцызнага алкаголю склаў 27 літраў, кошт — 1,7 мільёна рублёў. Затрыманы прызнаўся, што такім спосабам вырашыў зарабіць. Ён здымае кватэру і шукае працу.

**БелаПАН, Ежедневник**

# Кіргізскі сцэнар для беларускага хамелеона: ці будуць у Мінску страляць?

Працяг са старонкі 1.

У фільмах пра Беларусь Масква апасродкавана звяртаецца да КДБ. Фільм НТВ падкрэслівае, што ў спецслужбе Лукашэнку баяцца, але не паважаюць. І там ёсць сілы, гатовыя падтрымаць апазіцыю.

Крэмль падгульвае апазіцыі. Пачалося з запрашэння рэдактараў незалежных СМІ да Мядзведзева. Цяпер расійскае ТВ дае слова людзям, якія ў Беларусі ў «чорных спісах». Гэта добра для ўзмацнення палітычнага плюралізму. Але ці не хавае такая падтрымка прытоенай пагрозы для незалежнасці?

Чаго дабіваецца Расія? Захавання статус-кво ў адносінах з Беларуссю і пры гэтым змяншэння энергетычнага гранта.

### Драма паўторыцца ў выглядзе фарсу?

Ці пад сілу Маскве ажыццявіць у еўрапейскай, даволі заможнай краіне той сцэнар, якому яна паспрыяла ў азіяцкай, беднай Кіргізіі?

Сцэнар мірнай рэвалюцыі пры падтрымцы Захаду рэалізаваўся ў Сербіі, Славаччыне, Харватыі, Украіне, але не ўдаўся ў Беларусі з яе недафармаванай палітычнай самастойнасцю.

Масква можа падгульваць апазіцыі, падгульваць, як кажа Павал Шарамет, самаму моцнаму канкурэнту Лукашэнкі, хто б ён ні быў, у разліку на тое, што пасля выбараў сістэма вернецца да ранейшых каардынат, толькі з іншым лідэрам, але толькі падгульваць: ход падзей урэшце будзе залежаць ад саміх беларусаў.

Дарэчы, вынік кіргізскіх пераменаў дагэтуль не ясны. Краіна перажыла некалькі месяцаў нестабільнасці. Яе геапалітычная арыентацыя застаецца пад пытаннем.

Яшчэ раз паўторым: тое ў Азіі. Перамены ў Беларусі, калі будуць, імаверна, пойдуць па сцэнары, уласцівым цэнтральнаеўрапейскім краінам.

### Голасам грамадства стане вуліца

Голасам беларускага грамадства ў кожным разе стане вуліца. Як у часе ўздыму 2006-га, у 2011-м зноў усё вырашыць Плошча. У 2006-м сілаў для змены сістэмы аказалася замала, але ёй быў нанесены моцны ўдар, ад якога Лукашэнка фізічна доўга адыходзіў. Беспрыкладная ахвярнасць моладзі ў барацьбе за свабоду пераварнула ўяўленні свету пра Беларусь.

Калі ў 2011-м у сістэме накануецца адбыцца зменам, яны адбудуцца пад тымі сцягамі, якія запануюць на вуліцы. Запануюць бел-чырвона-белыя — яны і стануць дзяржаўнымі.

### Чым слабейшы Лукашэнка...

Дэмакратычныя правілы палітычнай гульні ўзнікаюць не тады, калі нейкі добры дзядзька іх уводзіць. Дэмакратыя ўзнікае, калі палітычныя гульцы не маюць дастаткова сілаў, каб ліквідаваць адзін другога цалкам, ці калі ёсць вонкавыя пагрозы, больш небяспечныя за ўнутраныя, для змагання з якімі патрэбная дэмакратычная мабілізацыя ці падтрымка дэмакратычнага свету. У гэтым сэнсе чым слабейшы будзе Лукашэнка, тым больш будзе шанцаў на пераход да дэмакратыі.

Але ці пры дэмакратыі ў нас будзе больш шанцаў для ўмацавання нацыі?

### Гарант ці не гарант?

Лукашэнкаўцы аргументуюць, што толькі аўтарытарызм засцерагае нас ад умяшання Расіі, ад бязладдзя кшталту таго, якое Масква спансаравала ў XVIII стагоддзі, ад эканамічнай залежнасці. Што Масква з яе незлічонымі грашыма зможа маніпуляваць беларускімі палітыкамі і грамадскай думкай, дай толькі Лукашэнку аслабіць кантроль. Прыклады Украіны, Малдовы ці Эстоніі паказваюць слабасць такой аргументацыі.

Так, Беларусь больш русіфікаваная, чым Украіна. Але адначасова больш гамагенная і менш карумпаваная. Наадварот, пры дэмакратыі Беларусь мае шанцы рухацца ў бок скандынаўска-балтыйскай мадэлі.

### Ціснуць, але без Масквы

І памятайма, што менавіта аўтарытарызм забраў сцяг, знішчыў мову. Дэмакратыя будзе азначаць і выхад беларускай культуры з няволі.

Нельга запрашаць Маскву ў якасці арбітра ўнутрыбеларускіх пытанняў. Але беларускае грамадства абавязанае выкарыстаць новую сітуацыю для змены сістэмы. У кожным разе, менавіта зараз грамадства павінна ціснуць на ўлады па ўсіх азімутах: палітычным, эканамічным, у пытанні правоў працоўных, у мове й свабодзе для нацыянальных СМІ. Але — з розумам ціснуць.

### Хто возьмецца за зброю?

Давайце ўспомнім, як скідалі Бакіева. Збройна!

Апазіцыя дастала аўтаматы, захапіла БТРы і ў баі здабыла прэзідэнцкі палац. Пры гэтым загінула 80 чалавек.

Варта адзначыць, што бішкекская паўлічэнкі не надта за Бакіева стараліся. Але калі б



Бішкек, 7 красавіка. Штурм Адміністрацыі прэзідэнта.

кіргізская апазіцыя дзейнічала без зброі, улады разагналі б яе дэманстрацыю, як і ранейшыя.

Каб кіргізскі сцэнар рэалізаваўся ў Беларусі, тут павінен знайсціся хтосьці, хто арганізуе ўзброеную барацьбу за ўладу. І Масква сваімі фільмамі і паводзінамі намякае: мы такое падтрымаем.

Але ў Беларусі такой сілы няма, і зброі няма. І нават калі зброю не праблема завезці з Расіі праз адкрытую мяжу, то і наёмнікаў не знойдзецца, каб страляць. Традыцыі не такоўскія. Зрэшты, праз гэтую лукашэнкаўскую псеўдамяжу пад Хоцімскам можна не толькі зброю перавезці, але і слана баявога. Або наёмнікаў, каб з той зброі стралялі... Гэтак жа арганізоўвалі да пары тыповыя перавароты ў афрыканскіх краінах.

### І прэтарыянец у прэзідэнцкім палацы

Вось такі кіргізскі сцэнар быў бы найгоршым для Беларусі варыянтам. Ахвяры, нелегітымная ўлада, прыніжаная грамадства, дэмаралізаваная палітычная эліта. І нават, магчыма, нейкі прэтарыянец кшталту Кадырава ў прэзідэнцкім палацы.

Як паказвае досвед цэнтральнаеўрапейскіх краінаў, мірная, спеўная рэвалюцыя надзяляе новую ўладу высокай легітымнасцю, асабліва калі яна суправаджаецца хуткай інтэграцыяй краіны ў еўрапейскія, стабілізуючыя

інстытуты. А вось прэтарыянскі пераварот, наадварот, вядзе да чахарды і нестабільнасці.

Цікава, што ў Грузіі таксама была спроба арганізаваць узброены мяцеж, але яна праваліласся.

### Аслабленне Беларусі

Што значыць выбар Расіяй кіргізскага сцэнару ў дачыненні Беларусі? Як вядома, у Кіргізіі Расія падтрымлівала не якуюсьці палітычную сілу, а падзенне ўлады без яснай альтэрнатывы.

Трапна звяртае ўвагу Віталь Сіліцкі: Расія пачала мачыць Лукашэнку, калі ён перабаваў ад яе адыцсі.

Кіргізскі сцэнар азначае, што Расія будзе імкнуцца найперш да аслаблення Беларусі, да дэстабілізацыі. А беларусам трэба пераменаў без дэстабілізацыі.

### Мяняць сістэму

Найгоршае — каб змена ўлады адбылася пераваротам. Нельга, каб пралілася кроў. У той жа час самы момант халаднакроўна і мірна ціснуць на ўлады з тым, каб у краіне змянілася сістэма.

Расія будзе рабіць сваё, што задумала. Але беларускаму палітычнаму класу і, шырэй, грамадству трэба выкарыстоўваць сітуацыю не для змены ўлады, а для змены сістэмы. Памылкаю было б гуртавацца вакол дыктатуры толькі таму, што тая спекулюе на пытанні незалежнасці.



## Аўтуховіч: Няма надзеяў на Расію

У рацыянальным і адначасова пранізлівым лісце Мікалай Аўтуховіч заклікае апазіцыю да яднання і дзеяння.

Народ радуецца таму, што Расія нарэшце адумалася і заганяе Аляксандра Лукашэнку ў тупік, бо людзі спадзяюцца, што менавіта Расія развяжа гэты вузел.

Але ў мяне асабіста няма надзеяў на Расію. Не зможа яна зрабіць гэтага, час пайшоў, мы самастойная дзяржава, і калі наспела неабходнасць змены ўлады, то зрабіць гэта мы павінны толькі самі, каб потым нікому і нічым не быць абавязанымі.

## Мытны саюз з дулінай у кішэні

Замежныя лідэры не любяць беларускага партнёра яшчэ і за тое, што ён можа ў любы момант вынесці на публіку канфідэнцыйныя размовы. Піша **Аляксандр Класкоўскі**.

Так было і 16 ліпеня, калі адбылася «здача» Мядзведзева: той, маўляў, фактычна пацвердзіў у вузкім коле, што Мытны саюз — страшылка для Захаду, геапалітычная цацка.

«Я задаў шэраг пытанняў, — выклаў беларускі кіраўнік усю праўду пра закрытае паседжанне падрыхтоўчага перыяду.

— Вы хочаце стварыць Мытны саюз, каб пужнуць Амерыку ды Захад: калі вы нас у Сусветную гандлёвую арганізацыю не бераце, і мы тут сваю СГА створым, у піку? Калі так, вы нам скажыце пра гэта, можа, мы ў гэтым вас і падтрымаем. Адказ быў такі: ну, а што тут кепскага, можа, і так».

Беларускае начальства нутром чуе, што Расія «кіне» з абяцаным раем у выглядзе адзінай эканамічнай прасторы, калі, маўляў, шырокай плыннню пацячэ да нас бязмытная нафта. Хутчэй пачнуць душыць адзінай валютай і г.д. Аднак жа перад выбарчай кампаніяй ляскаць дзвярыма рызыкоўна.

Таму абраная звыклая тактыка: дакументы па Мытным саюзе Мінск падпісаў, але — з дуляй у кішэні.

Меркаванні ў артыкулах на старонцы «Каментары» могуць супадаць, а могуць і не супадаць з меркаваннем Рэдакцыі.




## Грунвальд крэсовы

У Бернардынскім касцёле ў Гродне адкрытая памятная шыльда да гадавіны Грунвальдскай перамогі. Шыльду спансаравалі мясцовыя палякі. Тэкст на ёй — па-польску: «Na pamiątkę zwycięstwa wojsk polsko-litewskich nad Zakonem Krzyżackim w polach Grunwaldu», — чытаем на шыльдзе.

У справе ёсць дзве прыкрасці.

Першае — гэта мова. Права фундатара — выбіраць мову шыльды. Але аднy мову. Другая ў Беларусі мусіць быць беларускай.

Па-другое, час перастаць ігнараваць беларусаў. Можна доўга разважаць, што «літоўскі» — гэта прыналежны да ВКЛ увогуле. Але тым самым працягваецца савецкая шавіністычная традыцыя, якая скарысталася з разыходжання гістарычных назваў з сучаснымі, каб сцвярджаць, што беларусы не мелі ўласнай гісторыі да 1917 году. Продкі сучасных беларусаў біліся пад Грунвальдам. Ergo, трэба пісаць, каб было зразумела ў нашы часы: перамога польска-беларуска-літоўскіх войскаў.

Прыкра, што такія памылкі дапускаюць дзеячы незалежнага Саюза палякаў.

**Сяргей Мікулевіч**

# «Палітычны хамелеон сыдзе бясслаўна»

Працяг са старонкі 1.

«Сапраўды, ніякай афіцыйнай рэакцыі на выкрывальніцкі фільм у Беларусі не было. Праўда, вельмі нечакана адвакатам Аляксандра Лукашэнкі выступіў Міхаіл Саакашвілі. Той самы Саакашвілі, які яшчэ нядаўна крытыкаваў беларускага кіраўніка за дыктатуру і нават пасылаў у Мінск спецгрупу. Пра яе выкрыццё беларускія спецслужбы далажылі напярэдадні выбараў 2006 году, абвінавачваючы «людзей Саакашвілі» ў падрыхтоўцы ў Беларусі рэвалюцыі па сцэнары тбіліскай «рэвалюцыі ружаў», — іранізуюць расійцы.

Цытуецца выказванне Саакашвілі пра мінскіх людажэраў, якія нібыта развяліся ў Мінску ў 1990-я. «Праблемы, пра якія з усмешкай кажа Саакашвілі, — гэта зніклыя без вестак некалькі дзясяткаў палітычных праціўнікаў Лукашэнкі: віцэ-спікер беларускага Вярхоўнага Савета Віктар Ганчар, былы міністр унутраных справаў Юры Захаранка, наш калега, тэлеаператар і былы асабісты аператар Лукашэнкі Зміцер Завадскі, а таксама грамадскі дзеяч Анатоль Красоўскі», — заявілі ў расійскіх тэленавінах.

У лідэра ліберал-дэмакратаў Расіі Уладзіміра Жырыноўскага пазіцыя традыцыйна мяняецца з афіцыйным меркаваннем Крамля. Ён ужо называў Лукашэнку «конюхам», казаў, што Беларусі можа дапамагчы толькі снайпер, а потым прыязджаў на выбары, каб агітаваць за Лукашэнку.

«Лукашэнка і Саакашвілі — два чалавекі, якія нанеслі максімальную шкоду на постсавецкай прасторы, — грымеў Жырыноўскі. — І ў Грузіі трупы, і ў Беларусі трупы. І ў Грузіі закрываюць газеты, тэлебачанне, і ў Беларусі. То бок два дыктатары: адзін на Каўказе, другі тут, на мяжы з Польшчай. І яны, як рука руку, адзін другога мыюць. Лукашэнка разумее, што яму канец. Але Бакіеў да яго прыбег. А Лукашэнка куды паедзе? Толькі ў Тбілісі. Яго нідзе не прымуць. Таму яны і сустракаюцца цяпер. І Саакашвілі разумее, што яму давядзецца бегчы. Вось так яны, дыктатары, адзін аднаго падтрымліваюць, каб у будучыні мець магчымасць адыходу», — сказаў Жырыноўскі.

Зрэшты, цытаваліся не толькі расійскія палітыкі. Словы далі Дэвіду Крэймеру, галоўнаму эксперту па краінах Усходняй Еўропы амерыканскага Фонда імя Джорджа Маршала.

«Яго прыярытэт — гэта застацца пры ўладзе. Кантраляваць усё. Ён пастаянна жанглюе сваімі тактыкамі, каб застацца ва ўладзе, утрымліваць кантроль у сваіх руках, ва ўрадзе, у краіне. Адзін дзень ён сябруе з Расіяй, іншы не сябруе. Гэтаксама ён паводзіць сябе з Захадам. Замест таго каб сказаць прадстаўнікам Еўрасаюза, што ён гатовы супрацоўнічаць з імі, ён сказаў, што не будзе скакаць пад іх дудку. Ён, безумоўна, разумны, але дыктатарская жылка і жаданне застацца ля ўлады засланяюць увесь здаровы сэнс».

Напрыканцы ўспамінаецца пра новы закон аб інтэрнэце, а таксама закон, які абавязвае псіхолагаў даносіць на сваіх пацыентаў.

### «Нельга ссаць усіх матак»

Нашмат больш жорсткім атрымаўся рэпартаж на тэлеканале «Россия», які таксама паказалі ў Беларусі. Журналіст тэлеканала таксама абураецца з прычыны інтэрв'ю Саакашвілі для БТ.

Згадваецца, што Лукашэнка прадказваў уцёкі Саакашвілі ў ЗША, што не ўспрымаў яго, а цяпер яны пачалі братацца. «Хто каго больш выкарыстоўвае?» — пытаецца аўтар рэпартажу.

«Няма ніякіх сумневаў, што сцэнар гэтага эпізоду пісаў асабіста Аляксандр Рыгоравіч, — упэўнены Мікалай Левічаў, кіраўнік фракцыі «Справядлівая Расія» ў Дзярждуме. — Я ўпэўнены, што беларускі народ дасць у свой час гэтаму ацэнку. Любы палітычны хамелеон сыходзіць з палітычнай сцэны бясслаўна».




«Калі ты саюзнік Грузіі — няма пытанняў, але калі ты саюзнік Расіі і з гэтым звязаныя ўсе твае дывідэнды, паводзь сябе адэкватна: не прымай Бакіева, Беразоўскага. Нельга ссаць усіх матак — заявіў у сюжэце палітычны аглядальнік Мікалай Сванідзэ. — Ён пачаў гаварыць аб незалежнасці, але пры гэтым яшчэ і хаміць Расіі».

«Лукашэнка, здаецца, спальвае масты, — працягвае вядоўца. — Але непадобна, што гэтым разам будзе лёгка перайсці ўброд. Гэта ў мінулыя гады, атрымліваючы танны расійскі газ, Мінск засяродзіў у эканоміцы 50 мільярдаў даляраў. Але Масква так больш не хоча. Прапануецца рэальная інтэграцыя. Вось толькі складана на яе пагадзіцца, калі адна рука з дуляй у кішэні, а іншая — з каменем за пазухай».

### «Бацьку крыюць па кампрамацеры»

З'явіўся матэрыял пра Лукашэнку і ў адным з апошніх нумароў «Маскоўскага камсамольца». Артыкул быў аздоблены карыкатурай на Лукашэнку ў нацысцкай форме і з надпісам: «Не ўсё было кепска ў Германіі пры Адольфу Гітлеру».

«Уколы расійскіх СМІ для беларускага лідэра хоць і непрыемныя, але не смяротныя. Паводле апошніх сацыялагічных апытанняў, рэйтынг Аляксандра Рыгоравіча перавышае 40%. Шматлікія апазіцыйныя кандыдаты маюць разам да 25%. Такім чынам, Бацька, пры некаторых маніпуляцыях вынікамі, упэўнена пераможа ў першым туры будучых прэзідэнцкіх выбараў», — піша «Камсамолец».

Пры гэтым застаецца нявызначанай канчатковая мэта паказу кампраметавальных фільмаў на расійскім тэлебачанні. У Беларусі іх у любым выпадку паглядзіць абмежаваная колькасць палітактыўных карыстальнікаў інтэрнэту, якія і так ведаюць выкладзеныя факты.

**Зміцер Панкавец**

## Някляеў пайшоў па слядах Казуліна

Лідэр кампаніі «Гавары праўду» Уладзімір Някляеў мае намер стаць «народным дэлегатам» чарговага Усебеларускага народнага сходу. Для гэтага актывісты кампаніі хочуць сабраць 20 тысяч подпісаў.

«Мы вылучым свайго народнага дэлегата на гэты сход, каб наш дэлегат там сказаў дэлегатам ад улады народную праўду. Па нашых падліках, каб стаць дэлегатам, хопіць і 2 тысяч подпісаў. Але мы збяром у 10 разоў больш», — кажа У.Някляеў.

Варта адзначыць, што ў 2006 кандыдат у прэзідэнты Аляксандр Казулін таксама паспрабаваў прайсці на Усебеларускі народны сход. Але быў збіты і затрыманы.

Што да ўдзелу ў прэзідэнцкіх выбарах, то Някляеў не спяшаецца заяўляць аб сваім удзеле ў іх. Кажа, што рашэнне будзе прынятае, калі выбары будуць абвешчаны.

Рашэнне Някляева ўспрымаецца экспертамі неадназначна. Многія ў апазіцыі мяркуюць, што няма чаго прызнаваць аперэтачны «сход».

**ЗП**

## Вока за вока, зуб за зуб

Афіцыйныя СМІ расказваюць усю праўду пра саюзную дзяржаву.

Да беларуска-расійскай інфармацыйнай вайны падключаюцца ўсе дзяржаўныя СМІ Беларусі. Ніякай скандальнай жаўцізны — імі расказваецца толькі праўда пра саюзную Расію. Але дзе афіцыйная Беларусь была з гэта праўдай раней?

Газета «Рэспубліка» ў артыкуле «Соседи глазами экспертов» у нумары за 20 чэрвеня вырашыла расказаць чытачам пра даклад апазіцыйнага палітыка Барыса Нямцова «Пуцін. Вынікі 10 гадоў». Факт далёка не новы — даклад быў апублікаваны месяц таму, але звярнуцца да яго «Рэспубліка» вырашыла толькі цяпер. «На жаль, многія дзікасці сталі ў расійскім грамадстве нормай, — піша аўтарка газеты і далей на цэлую старонку цытуе Нямцова. Бездань карупцыі, фінансавыя махінацыі «Газпрома», тотальная няроўнасць... Для падмацавання нават прыведзеныя ананімныя меркаванні з інтэрнэту. Цікава, што пад гарачую руку «Рэспублікі» трапіў і аўтар дакладу Барыс Нямцоў. «Сам аўтар не з тых крышталёва чыстых персон, якія могуць судзіць іншых. У яго біяграфіі, як і ва ўсёй расійскай палітцы, нямала цёмных плямаў».

> «Перазагрузка адносінаў з ЗША дапамагае расійскім дыктатарам умацоўваць уладу».

Оруэлаўская «пяціхвілінкі нянавісці» пачаў запускаць Першы канал беларускага тэлебачання. Звычайныя навіны, пятніца, 16 ліпеня: сюжэт «Расія — самая змрочная краіна ў Еўропе» працягнуўся ролікам «Незайздроснае месца Расіі ў рэйтынгу шчаслівых краін». А каб дапамагчы гледачам зрабіць правільныя высновы, БТ не паленавалася звярнуцца па выніку сацыялагічных апытанняў... забароненага ў Беларусі НІСЭПД — 48.6% беларусаў катэгарычна супраць аб'яднання з Расіяй. Прычым ідэі кожнага з трох сюжэтаў падаюцца вуснамі іншых крыніц інфармацыі. Меркаванне швейцарскіх часопісаў, рэйтынг «Форбс» — маўляў, так пра Расію думаюць усе, а не толькі мы.

«Звязда» пайшла іншым шляхам. Антырасійскі фон ствараецца праз пастаянныя дробныя інфармацыйныя паведамленні. «Перазагрузка адносінаў з ЗША дапамагае расійскім дыктатарам умацоўваць уладу», «Расія — самая змрочная краіна ў Еўропе, там выкрадаюць і забіваюць», «Расія прагінаецца перад ЗША, здраджваючы сваім нацыянальным інтарэсам» — загалоўкі і падзагалоўкі матэрыялаў газеты за апошні тыдзень. Вядома ж, кожнай думцы дадзенае аўтарства «нейтральнай» асобы.

**ВН**

## «Малдаўская апазіцыя абараняла не Вароніна, а свае мэты. І здабыла поспех»

Беларусь — чарговая краіна ў спісе інфармацыйных ворагаў Расіі. «Ахвярамі» найчасцей выступаюць суседзі па рэгіёне — Украіна, Грузія, Эстонія. У свой час у падобнай сітуацыі апынулася Малдова. Масквой была арганізаваная інфармацыйная атака на тагачаснага прэзідэнта краіны — камуніста Уладзіміра Вароніна. Якой была рэакцыя малдаўскага грамадства? На пытанні «Нашай Нівы» адказвае дырэктар малдаўскага Інстытута развіцця і сацыяльных ініцыятываў (IDIS) «*Viitorul*» Ігар Мунцяну. Дарэчы, па інфармацыі тамтэйшых СМІ, у найбліжэйшы час ён можа заняць пасаду амбасадара Малдовы ў ЗША.




**«Наша Ніва»: Як рэагавалі малдаўская ліберальная апазіцыя і грамадзянская супольнасць на атакі Масквы на прэзідэнта Вароніна? Чый бок яны занялі?**

**Ігар Мунцяну:** Я скажу, што ціск на Вароніна быў пастаянны. Мы, вядома ж, абаранялі не партыю ці ўласна прэзідэнта Вароніна, а тыя мэты, якія былі для нас важнымі. Грамадзянская супольнасць не ішла за секундным імгненным поспехам, а мэтаскіравана імкнулася да прасоўвання сваіх ідэй.

Мы выкарыстоўвалі вонкавыя палітычныя фактары ў сваіх інтарэсах. Варонін апынаўся фактычна ў пастцы — усе, і ўнутры краіны, і за мяжой, аб'ядноўваліся супраць яго.

У выніку прэзідэнт быў вымушаны фактычна развярнуць краіну з расійскага вектару на еўрапейскі. Пасля гэтага ціск стаў яшчэ большым. Асабліва ўзмацніўся ён пасля «каляровай» рэвалюцыі ў суседняй Украіне.

**«НН»: Ці адказвалі афіцыйная малдоўская прапаганда і СМІ, падкантрольныя прэзідэнту Вароніну, атакай на атаку, як гэта адбываецца ў выпадку з Беларуссю і Расіяй?**

**ІМ:** Гэта адбывалася вельмі-вельмі рэдка. Крытыка была сканцэнтраваная ўнутры краіны, а не выносілася за яе межы.

**Запісаў Віталь Несцераў**

# Андрэй Вардамацкі: Уплыў расійскіх навін змяншаецца

Гутарка з сацыёлагам, кіраўніком даследчыцкай лабараторыі «Новак».

**«Наша Ніва»: Уплыў расійскіх тэлеканалаў на Беларусі вялікі?**

**Андрэй Вардамацкі:** На самай справе вялікі і нават вельмі. Рэйтынгі расійскіх тэлеканалаў большыя, чым беларускіх. Але варта зазначыць, што рэйтынгі тэлеканалаў складаюцца з некалькіх частак. Ёсць частка навінная, а ёсць забаўляльная, дзе паказваюць розныя шоу, канцэрты, фільмы. Дык найбольшыя рэйтынгі мае якраз другая частка. Што датычыць навін, то яны, як правіла, перакрываюцца беларускім прадуктам. Таму мы назіраем змяншэнне ўплыву расійскіх навін на нашу краіну. Ёсць яшчэ такі фактар, што ў асаблівых выпадках расійскія навіны ці іх пэўныя сюжэты проста перакрываюцца, ніякай тэхнічнай цяжкасці ў гэтым няма.

**«НН»: А ці давяраюць людзі расійскім тэлеканалам?**

**АВ:** Я вам прывяду пэўныя лічбы рэйтынгаў перадачаў навін. Найбольшы рэйтынг мае расійская перадача «Время» (тэлеканал ОРТ) — 22% (у Мінску) і 19% (па краіне). Следам ідуць беларускія «Нашы навіны» (АНТ) — 20% і 17%. Прыкладна аднолькавыя пазіцыі ў «Вестей» («Россия») і «Панарамы» (БТ) — 3% і 4% адпаведна. Рэйтынг «24 гадзін» тэлеканала СТВ заўважна меншы — 1,2%. Можна гаварыць пра тое, што сітуацыю ў Расіі беларускія гледачы ведаюць не горш за беларускую. А, напрыклад, расійскіх палітычных актараў ведаюць нават лепш за беларускіх.

**«НН»: Паказ «Хроснага Бацькі» на НТВ адаб'ецца на рэйтынгу Лукашэнкі?**

**АВ:** Можна ўпэўнена казаць, што гэта адаб'ецца на рэйтынгу Лукашэнкі ў Расіі. Што датычыць Беларусі, то фільм прагледзела не так шмат людзей. Зрэшты, часта бывае, што такія выпады дзейнічаюць у процілеглым кірунку. Рэйтынгі, наадварот, могуць не знізіцца, а павысіцца. Яшчэ адным з вызначальных момантаў можа быць час паказу фільма. Чаму яго прадэманстравалі менавіта цяпер, калі ведалі пра ўсё гэта раней?

**«НН»: Ці шмат беларусаў ведае пра справы зніклых? Як успрымаюць гэтыя здарэнні?**

**АВ:** Не вельмі шмат. Але галоўнае нават не гэта. Самае важнае, як гэтыя знікненні ўспрымаюцца. А нейкага перажывання як цяжкай і страшнай рэчы няма. Людзі больш зацікаўленыя пытаннямі ўласнага дабрабыту і ростам цэнаў.

**Гутарыў Зміцер Панкавец**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Андрэй Вардамацкі** нар. 14 студзеня 1956 у пасёлку Джар–Курган (Узбекістан). Сацыёлаг, філосаф. Кіраўнік незалежнай лабараторыі аксіяметрычных даследаванняў «Новак». Скончыў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, стажыраваўся ў Мічыганскім універсітэце (ЗША). Кандыдат філасофскіх навук, доктар сацыялагічных навук, прафесар.

# Саакашвілі на БТ даў адлуп за «Хроснага Бацьку»

Увечары 15 ліпеня Першы нацыянальны канал паказаў інтэрв'ю з прэзідэнтам Грузіі Міхаілам Саакашвілі.

Ад пачатку грузінскі лідэр прызнаўся, што Грузія мае вялізныя сімпатыі да беларускага народа. «Насамрэч, калі ёсць нейкая еўрапеізаваная нацыя, дык гэта Беларусь», — заўважыў Міхаіл Саакашвілі.

Калі гутарка перайшла да прызнання Беларуссю Абхазіі і Паўднёвай Асеціі, Саакашвілі выказаў меркаванне, што Расія не мае права ціснуць па гэтым пытанні. «Цяпер свет гаворыць пра акупаваныя Расіяй нашы тэрыторыі. На маю думку, расійскі народ абсалютна не заслугоўвае, каб праз амбіцыі кіраўніцтва яго называлі акупантам. Спадзяюся, Беларусь зробіць мудра».

Пра адносіны з Расіяй Саакашвілі заявіў, што Грузія ўвесь час хоча ісці насустрач, але Масква патрабуе новых і новых саступак. Саакашвілі абвінаваціў Расію ў імперскіх замашках: «Думаю, што сітуацыя дастаткова знаёмая для ўсіх астатніх суседзяў Расіі, якая гатовая размаўляць са сваім суседам толькі шляхам ціску і шантажу, пагражаючы, што нам будзе горш».

Саакашвілі назваў сябе, магчыма, апошнім лідэрам Грузіі, які можа вольна цытаваць Пушкіна, Ясеніна і Бродскага, бо ў выніку цяперашніх падзей новае кіраўніцтва Грузіі зусім не будзе разумець Расію. «Прымушаю сына вучыць расійскую мову, але ён кажа, што гэта яму нідзе не спатрэбіцца».

Цэнтральнай часткай інтэрв'ю стала тэма расійскага інфармацыйнага ціску на Лукашэнку, і грузінскі лідэр прызнаўся, што «выпадкова бачыў», як расійскія каналы беларускага кіраўніка «ледзьве не ў канібалізме абвінавачваюць». «Калі сыплюцца ўсялякія абвінавачанні, і гэта робіцца з той краіны, дзе нядаўна забілі чалавека, якога я вельмі паважаў, Ганну Паліткоўскую, і забойцы не знойдзеныя, а на Паўночным Каўказе дзясяткі тысяч людзей проста зніклі... І раптам знайшлі, што ў 90-х гадах людажэры развяліся ў Мінску, — вядома ж, гэта сумна. Гэта мае пэўны прысмак прапагандысцкай вайны». Расія мае значна большыя праблемы са знікненнем людзей, мяркуе грузінскі лідэр.

Разам з тым, грузінскаму прэзідэнту цяжка ўявіць, чаму Беларусь з'яўляецца праблемай для Расіі. «Праўда ўсё адно знойдзе свой шлях», — падвёў рысу кіраўнік Грузіі.

«Мы краіна залатога руна і віна — мы гістарычная аснова Еўропы, — упэўнены грузінскі лідэр. — Цягам двух гадоў Грузія атрымае бязвізавы рэжым з Еўрасаюзам».

**Юльян Місюкевіч**

**Следам за Саакашвілі БТ пакажа інтэрв'ю з прэзідэнтам Латвіі**

З Валдзісам Затлерсам будзе гутарыць журналіст Дзмітрый Косцін. Фільм выйдзе ў эфір БТ у чацвер пасля праграмы «Панарама». У Расіі ўжо ўзвылі ад абурэння. «Дзмітрый Косцін прэзентуе бачанне дэмакратыі і абароны суверэнітэту ад «імперскіх замахаў» рэспублікі, у якой неанацызм стаў кутнім каменем дзяржаўнай ідэалогіі. Мяркуючы па ўсім, дзяржагітпрап саюзнай Беларусі дае трыбуну ўсім па-антырасійску настроеным прэзідэнтам постсавецкіх рэспублік», — піша расійскі сайт Regnum.

**Лябедзька: Словы Саакашвілі абразлівыя**

«Тое, што ён выступіў у ролі адваката беларускіх уладаў па знікненнях, было нечакана. Гэта вырашэнне тактычных задач шляхам адыходу ад агульных каштоўнасцяў. Тым больш, Саакашвілі — інфармаваны палітык. Ён ведаў, як галасавала грузінская дэлегацыя ў Радзе Еўропы па дакладзе аб зніклых. А цяперашнія словы — гэта абразлівае стаўленне да беларусаў».

**ЗП**

# Саннікаў, Шушкевіч, Лябедзька патрабуюць міжнароднага расследавання справаў зніклых

Беларускія апазіцыйныя палітыкі маюць намер звярнуцца ў ААН і Еўрапарламент з мэтай міжнароднага расследавання па справе зніклых.

Такую заяву ў пятніцу зрабілі каардынатар «Еўрапейскай Беларусі» Андрэй Саннікаў, былы кіраўнік Беларусі Станіслаў Шушкевіч, лідэр АГП Анатоль Лябедзька, кіраўнік партыі «Справядлівы свет» Сяргей Калякін, намеснік старшыні Партыі БНФ Рыгор Костусеў, а таксама кіраўнік Мінскай гарадской арганізацыі БНФ Віктар Івашкевіч.

Прэс-канферэнцыя выклікала вялікую цікавасць. Прыйшлі на яе не толькі прадстаўнікі расійскіх тэлеканалаў, але і Беларускага тэлебачання.

Андрэй Саннікаў зазначыў, што пасля «Хроснага Бацькі» «з'явіўся шанец пасунуць расследаванне знікненняў вядомых людзей. Можа з'явіцца і новая інфармацыя. У 2005 годзе пры ААН была створаная адмысловая камісія па справе расследавання забойства ліванскага прэм'ера Харыры. Мы будзем дамагацца падобнага».

Анатоль Лябедзька гаворыць, што ягоная партыя ўжо на наступны дзень пасля паказу фільма «Хросны Бацька» звярнулася ў Генеральную пракуратуру з мэтай завядзення крымінальнай справы па фактах, што былі агучаныя ў праграме НТВ, альбо завядзення справы на журналістаў. «Васілевіч маўчыць, але гэта не значыць, што павінныя маўчаць астатнія. Гэта таксама будзе гарантыяй бяспекі для тых палітыкаў, што збіраюцца ўдзельнічаць у прэзідэнцкіх выбарах сёлета».

Сяргей Калякін спыніўся на тым, што тэма знікненняў палітыкаў і журналістаў неаднаразова падымалася на сустрэчах з расійскімі партнёрамі. «Але ўсе 11 гадоў Расія не брала актыўнага ўдзелу ў расследаванні. Хутчэй за ўсё, калі ўлічыць цесныя сувязі беларускіх і расійскіх спецслужбаў, у Маскве валодаюць больш шырокай інфармацыяй па гэтых знікненнях», — кажа С.Калякін.

Станіслаў Шушкевіч лічыць, што беларускія паліттэхнолагі спрабуюць распаліць у Беларусі антырасійскую рыторыку. «Не можа Расія быць нашым ворагам, мы суседзі. Нам кажуць, што Лукашэнка — гарант незалежнасці, але не можа быць яе гарантам чалавек, які не разбіраецца ў беларускасці, мове, гісторыі. Нас такі кіраўнік не можа прывесці да незалежнасці».




PHOTO.BYMEDIA.NET

Віктар Івашкевіч паведаміў, што сёння ў Мінгарвыканкам падаецца заяўка на мітынг і шэсце на 16 жніўня з патрабаваннем расследаваць справы зніклых. Акцыя мае прайсці ад 18 да 20 гадзін па маршруце Акадэмія навук — плошча Свабоды.

**ЗП**

# Падарожжа на Поўдзень — адкрыццё Усходу

Пра Крым татарскі піша **Сяргей Харэўскі**.

Тыя, хто бываў у савецкія часы ў Крыме, не задумваліся, хто такія крымскія татары і куды яны падзеліся. У старых кварталах Еўпаторыі ці Бахчысарая тады можна было пабачыць адно закінутыя руіны, зацягнутыя калючым дротам. Толькі ў Алупцы, сонечным мястэчку ля мора, стаяў у засені пальмаў бюст лётчыку Амет-хану Султану, двойчы Герою Савецкага Саюза. Пра пасляваенны лёс гэтага легендарнага крымчака экскурсаводы маўчалі.

У 1956 годзе Амет-хан Султан разам з іншымі падпісаў ліст з просьбай аб рэабілітацыі крымскіх татараў, накіраваны ў ЦК КПУ. Адказу ён не дачакаўся. У 1971-м, у разгар застоя, легендарны лётчык загінуў падчас выпрабавальнага палёту. Чарговая просьба ветэранаў надаць аэрапорту Сімферопаля імя Амет-хана Султана да 65-годдзя Перамогі сустрэла катэгарычную адмову ўладаў Крыма... Гісторыя татараў, іх дэпартацыі і вяртання, іх самабытная культура — гэтым насычанае сёння паветра Крыму. Адпачываючы на Поўдні, вы можаце адкрыць для сябе Усход.

## Новыя мячэці

Куды ні кінь вокам у цэнтральным Крыме — на даляглядзе алоўкі мінарэтаў пры новых мячэцях. Дасавецкіх захавалася няшмат. Самыя шыкоўныя з іх — мячэць Джума Джамі ў Еўпаторыі ды пабудаваны яшчэ асманскімі майстрамі Муфці Джамі ў Феадосіі. Новым храмам з бетону, сілікатнае цэглы, падножнага каменю не стае выштукаванасці. Але растуць яны паўсюдна.

У Эскі Крыме пры дапамозе Турцыі аднавілі мячэць хана Узбека XIII стагоддзя. Але стары вартаўнік-муэдзін з прыкрасцю кажа, што моладзь болей ходзіць у новую, на арабскія грошы пастаўленую. На ўскрайку мястэчка, дзе расклаўся новы татарскі квартал, зіхціць навюткі храм, вакол якога багата маладых барадатых людзей. Для татараў мячэць — не проста места малітвы, але і клуб. Мусульмане тут складаюць маналітную ўму — грамаду. Спачатку будуюць мячэць і толькі пасля — хату. Іслам — галоўны цэмент татарскай супольнасці, бо моладзь збольшага страціла родную мову.

Першы намаз пачынаецца а палове на чацвёртую раніцы. Наступны — на ўзыходзе сонца. Крык муэдзіна, узмоцнены дынамікамі, робіць магутнае ўражанне сярод начное цішы, над духмянымі стэпавымі разлогамі. І мігценне маладзіка ў попельна-ружовым небе паказвае шлях...

**Эскі (Стары) Крым**

У XIII ст. старажытны Салхат атрымаў цяперашнюю назву — Крым, што азначае «роў», і стаў сталіцаю Крымскага юрта Арды. На вуліцы Халтурына захаваліся рэшткі вялікага медрэсе з мячэццю Узбека, збудаванай у 1314 г. Тутсама ёсць і такія ўнікальныя помнікі, як мячэць Бейбарса — правадыра мамлюкаў Егіпта, і Свінцовая мячэць, дзе замест рошчыны ўжыты літы свінец. Ёсць і армянскія, і грэчаскія святыні, восем музеяў — гістарычных і літаратурных, сярод якіх дом–музей Аляксандра Грына, Канстанціна Паўстоўскага, а таксама Музей этнаграфіі крымскіх татараў. Ёсць і санаторый, куды прыязджаў Максім Багдановіч. Тут паэт напісаў краязнаўчую брашуру «Стары Крым».

## Суседзі вярнуліся

Каларытны вартаўнік старажытнай мячэці Кебір Джамі ў Сімферопалі за паўгадзіны давёў нам, што іслам — самая праўдзівая, міралюбная і мудрая вера. А як складаюцца адносіны з суседзямі па квартале? Ніякіх праблемаў! За выключэннем... пяціразовага азану, заклiку на малітву, што гучыць з мінарэта праз рэпрадуктары. Ён пакрысе выганяе немусульманаў са старога горада — хаатычнага суплёту вузкіх вулачак, што быў тут і ў часы ханства.

Тых, хто памятае даваенныя часы, у Крыме засталіся адзінкі. Але ні ад кога я не пачуў кепскага слова пра былых суседзяў — татараў. Расказваюць казачныя гісторыі пра дзясяткі гатункаў грушаў, пра неверагодна смачныя і цяпер забытыя малочныя прадукты, аб працавітасці...

Тыя, хто засяляў спусцелы Крым у 1950-я, ставіліся да вяртанцаў насцярожана, баючыся маёмасных прэтэнзіяў. Але страх прайшоў, як татары пачалі будаваць сабе новыя вёскі. Затое з'явіўся новы — перад канкурэнцыяй з боку ўвішных, непітушчых суседзяў, якія бяруцца за працу з узыходам сонца. Ужо сёння вялікая частка сферы паслугаў, жывёлагадоўлі, харчавання, транспарту, гандлю апынулася ў руках татараў.

## Італьянцы запісваліся татарамі

Дзяцей татараў у паліклініках рэгіструюць асобна як прадстаўнікоў рэпрэсаванай этнічнай меншасці. Імі апякуюцца фонды, выдаткоўваюцца бюджэтныя грошы на культуру. Але, насуперак пашыранай думцы, з Крыму былі высланыя не толькі татары! Перад вайною выслалі туркаў, за імі — італьянцаў, што жылі тут з часоў генуэзскае ўлады і збудавалі тузін гарадоў ля мора, а ў 1940-м — дзясяткі тысячаў крымскіх немцаў. Італьянцы, каб не трапіць у дэпартацыю, перапісваліся на татараў. І паехалі з імі на чужыну ў 1944 годзе, як і караімы, і цыганы-мусульмане, што цудам перажылі нямецкі генацыд.

Агулам па нацыянальнай прыкмеце ў спісах на вываз аказаліся 180 тысячаў чалавек. А сёння адных татараў у Крыме — 243 433 чалавекі, паводле апошняга перапісу, і лічба расце... Старэйшыя вяртанцы маюць добрую адукацыю. Гэта дактары, інжынеры, настаўнікі. А вось іх дзеці атрымаць належную адукацыю не паспелі.

Тры чвэрці прыбышоў нарадзіліся ў Цэнтральнай Азіі, часам ужо ў другім пакаленні. З нетраў кантынента яны прывозяць азіяцкую ментальнасць, звычаі, густы. Моладзь слаба валодае роднай моваю, але многія ведаюць, напрыклад, узбецкую ці казахскую. Яны цяпер не еўрапейцы ментальна. Але ў стаўленні да працы імкнуцца трымаць еўрастандарт.



Бахчысарайскі палац.

## Тут быў Багдановіч

Як стараюцца выжыць татары ў Крыме і зладзіць новае жыццё, добра відаць у Эскі (Старым) Крыме, гарадку, чыя гісторыя налічвае не адно тысячагоддзе. Ён прывабны чыстым здаровым паветрам, дубровамі і лясамі, гарамі з пячорамі і маляўнічымі цяснінамі. Раю ў Старым Крыме наведаць крымскататарскія чайханы і кавярні — не пашкадуеце.

На рагу вуліцы Савецкай і Сімферопальскае шашы абавязкова трэба зайсці ва ўнікальны прыватны музей, што трымае татарская сям'я, якая вярнулася з Кыргызстану. Гасцінны гаспадар, які быў дэпартаваны дзіцем, на самае бачнае месца расставіў рэчы сваіх бацькоў і дзядоў, што захаваліся ў выгнанні. Яшчэ тут багата антычных і скіфскіх рэчаў. А на падворку вас будзе чакаць шчодры стол у цяністых шатах вінаграду.

Ёсць у Эскі Крыме і санаторый, куды некалі прыязджаў Максім Багдановіч. Тут паэт напісаў першую краязнаўчую брашуру «Стары Крым» ды апавёў пра сваё жыццё тут ва ўласных дзённіках. Пра гэта хораша апавядаюць у тутэйшым музеі.

## Бахчысарай

Духоўны цэнтр крымскіх татараў — Бахчысарай — натхняў калісь Адама Міцкевіча. Тут найбольшы асяродак крымскататарскае творчай інтэлігенцыі, мастакоў, народных майстроў. Тут можна набыць эксклюзіўныя мастацкія рэчы. Вакол адроджанага Ханскага палаца, пры якім збярогся мізар (могілкі) з пахаваннямі славутых валадароў, якіх баяліся і ў нашых мясцінах, ёсць музеі і галерэі. З мінарэтаў разносяцца гукі азану, а па-над дварамі — водары добрых усходніх страваў. Дзятва імпэтна заклікае ў кавярні ды крамы.

Можна адпачыць і падсілкавацца ва ўтульным гатэліку «Дыляра-ханум», што амаль насупраць палаца, толькі вышэй у горы. Цэны ў ім вельмі памяркоўныя — ад 10 да 20 даляраў з чалавека ў дзень. А ўжо ж від з вокнаў на ваколіцы не расчаруе.

Пры гатэліку — кавярня «Мусафір», літаральна насупраць ханскага палаца. Тут можна выцягнуць здарожаныя ногі і замовіць духмяную зялёную гарбату. Кавярня спецыялізуецца на традыцыйнай крымскай кухні — найсмачнейшы плоў, люля-кебаб, янтык, манты, лагман, шурпа. Галоўны кухар штосезон спецыяльна прыязджае з Узбекістану. Вышэй у горы, на канцы старога Бахчысарая, у Салачыку, шырока расчыніў свае вароты «Караван-сарай» — рэстаран-кавярня-паркінг. Тут прапануюць надзіва смачныя стравы традыцыйнай кухні.

Вяртаючыся з Крыму, у цягніку стаў сведкам спрэчкі між украінцам і расійцам, каму мусіць належаць Крым. Мужыкі былі нападпітку, спрачаліся жарсна, але не злосна. За імі моўчкі назіраў чацвёрты наш сусед, з выразна ўсходнім тварам. А пасля паставіў кропку ў палеміцы: «Крым будзе альбо татарскім, альбо мёртвым!». І, каб залагодзіць рэзкасць, шырака і без аніякай злосці ўсміхнуўся нам усім.



Вярнуўшыся з выгнання, татары паставілі свае кварталы і мячэці ў голым стэпе.

# Пякельнае «Басовішча»

Да крыўднага мала было гледачоў з Беларусі. Піша **Сямён Печанко**.

Злая іронія лёсу — абяцаючы пякельны, без адзінай кроплі дажджу, сквар на ўсе дні сёлетняга «Басовішча», сіноптыкі гэтым разам не памыліліся. Сонца пачынала смажыць ад 7-й раніцы. А ўжо праз колькі гадзін знаходзіцца на адкрытай прасторы рабілася папросту небяспечна. Кароткую палёгку прыносілі аднадзве гадзіны перад світанкам, а потым пекла ізноў вярталася на зямлю.


АЛЕСЬ ПІЛЕЦКІ

### Як за Пінячэтам

Анамальная спёка агаліла некалькі істотных пралікаў у арганізацыі фестывалю. Гэтым разам намётавае мястэчка разбілі на пляцоўцы былога вайсковага гарадка, дзе не тое што дрэваў — аніводнага куста няма. З-за гарачыні мястэчка ад раніцы і да позняга вечара нібы вымірала. «Абгарадзілі, як стадыён у Чылі за Пінячэтам. Толькі за гэты «канцлагер» яшчэ і плаціць трэба», — сумна жартавалі жыхары мястэчка. У фестывальнай краме прадавалі кашулькі з доўгім рукавом, затое не было там кепак і панамаў з банданамі. Госці фэсту ратаваліся ад спёкі на возеры, у лесе і каля піўных ятак. Былі і аптымісты, якія радаваліся рэдкай магчымасці змяніць офісны загар на сапраўдны.

Да хібаў арганізацыі, не звязаных са стыхіяй, можна смела аднесці бяздарных вядоўцаў. Склалася ўражанне, што лідэр «Зніча» Алесь Таболіч і рэпер Krou проста бліжэй за астатніх апынуліся каля мікрафона. Хлопцы блыталіся ў назвах польскіх гуртоў, шмат і няўцямна прамаўлялі са сцэны. Вердыкт ветэранаў «Басовішча» — трэба вяртаць Памідорава або Шалкевіча.

### За тысячы кіламетраў, каб убачыць

Першае, што кінулася ў вочы на «Басовішчы», — да крыўднага малая колькасць гледачоў з Беларусі. Прыехалі тыя, хто меў візу ды не разлічваў на ласку арганізатараў. На фэсце неадноўчы даводзілася чуць размовы пра тое, што палякі не далі бясплатных візаў, каб беларусы не паехалі на дурніцу на Грунвальд. Арганізатары ж патлумачылі сітуацыю новымі правіламі выдачы дакументаў. У апошні момант яны здолелі афарміць візы для музыкаў. Тым не менш, беларусы былі гэтымі днямі ў Гарадку. Некаторыя прыехалі за тысячу кіламетраў з Расіі, каб на свае вочы пабачыць легендарны фэст.

Сярод шчаслівых уладальнікаў візаў былі актывісты грамадзянскай кампаніі «Гавары праўду», якія разгарнулі на «Басовішчы» свой намёт. На фэст яны прывезлі майкі з лагатыпам кампаніі і надпісам «Басовішча-2010». Іх можна было атрымаць бясплатна, набыўшы майку з афіцыйным лагатыпам фестывалю. Варта прызнаць, такі піяркрок атрымаўся досыць удалым: майкі «ГП» размялі за гадзіну.

### Ганьба Open Space

Сёлета фэст ладзіўся пад дэвізам Musica libertad. Упершыню Гарадок наведаў гурт «Ляпіс Трубяцкой», які стаў хэдлайнерам фэсту. У якасці зорак і гасцей на галоўным канцэрце выступалі «Троіца», «Гурзуф», «Адыс Абеба», Litvintroll, Re1ikt, Zatoczka ды польскія Rima і Lipali. Rima адкрыла фэст разам з групай дзяцей песняй «Я нарадзіўся тут».

У 2010 на фэсце адрадзілася конкурсная праграма. Удзельнікі мелі заданне напісаць песню на словы Ларысы Геніюш. З пяці гуртоў-канкурсантаў магілёўцы Akute, былыя «Глюкі», справіліся з задачай найлепш, што і было адзначана журы.

А вось мінчукі з Open Space, што выступалі ў рамках вольнай сцэны, зганьбіліся дурнаватымі жартамі з беларускай ды польскай моваў. Пры гэтым вакаліст гурта дэманстраваў сур'ёзныя прыкметы «зорнай» хваробы.

### «Парадачны бардак на мяжы»

У адным з інтэрв'ю напярэдадні арганізатары выказвалі лёгкую заклапочанасць з нагоды ўдзелу ў фэсце гурта «Ляпіс Трубяцкой». Маўляў, ведаем, якія перформансы яны выкабляюць на сцэне. Міхалок таксама за словам у кішэню не палез: пагадзіўся выступіць, але пры гэтым ахарактарызаваў «Басовішча» як «парадачны бардак на мяжы».

Але дарэмна перажывалі арганізатары — канцэрт «Ляпісаў» прайшоў на «ўра». Музыкі ўлічылі характар мерапрыемства і аўдыторыі: не стамляліся казаць «дзякуй», звярталіся да гледачоў «паважанае спадарства» ды выканалі ўсе свае беларускамоўныя хіты. «Belarus Freedom» магла б стаць гімнам сёлетняга фестывалю.

Паназіраць за Міхалкам і Ко прыйшлі ўдзельнікі «Троіцы», што выступалі наступнымі. Іван Кірчук выглядаў заклапочаным. Ягоныя трывогі, цалкам магчыма, былі недарэмнымі. Пасля звышэмацыйнага сэту «Ляпісаў» з вар'яцкімі скокамі каля сцэны публіцы спатрэбілася досыць часу, каб наладзіцца на медытатыўную хвалю этнатрыа. Але і «Троіца» ўзяла сваё.

Падсумоўваючы, можна сказаць, што фэст у Гарадку атрымаўся. Ён вытрымаў эксперыменты арганізатараў, спёку і невялікую змену музычнага фармату. Адсутнасць «Крамы», «Палацу» ды «N.R.M.» не стала катастрофай. :B:N і «Гурзуф», Rima і Lipali, «Ляпіс Трубяцкой» і «Троіца» ды іншыя годна глядзеліся на сцэне 21-га «Басовішча».

**Сямён Печанко**

## Стваральнікі баевіка з Ван Дамам хацелі арандаваць «Беларусьфільм» за $ 300 тысяч




Нядаўна «Беларусьфільм» наведалі прадстаўнікі амерыканскай кампаніі MPCA. Прадусары Джасцін Бурш, Патрык Ньювал, рэжысёр і сцэнарыст Эрнэст Барбараш падалі праект баевіка з працоўнай назвай «Зброя» (аўтар сцэнару Аарон Рахсаан Томас). Адну з роляў у гэтым фільме нібыта мае сыграць Жан-Клод Ван Дам.

Кінастудыі прапанавана стаць тэхнічнаю базай кінастужкі, пабудаваць дэкарацыі, падабраць здымачную групу на чале з дырэктарам.

Як паведамілі супрацоўнікі «Беларусьфільма», сума, якую прапанавалі студыі за арэнду, — 300 тысяч даляраў. Для параўнання, расійскія кінавытворцы за такія паслугі плацяць Нацыянальнай кінастудыі каля мільёна даляраў.

Што да самой карціны, дык тыя, хто бачыў сцэнар, адзначаюць, што «гэта нават не фільм катэгорыі «B». (Фільмамі катэгорыі «B» называюць нізкаякасныя, шырспажыўныя карціны). Таксама няма пэўнасці, сапраўды ў стужцы будзе здымацца Ван Дам, кажуць на кінастудыі, ці ягонае імя толькі выкарыстоўваецца ў якасці нажыўкі.

**Андрэй Расінскі**

## Супрановіч: лёс Be Free ў руках беларускіх уладаў

Штогадовы рок-фестываль Be Free, што ладзіцца ва Украіне, пад пагрозай знікнення.

Мэрыя Чарнігава, дзе меркавалася «прапісаць» фэст беларускай музыкі пасля трох гадоў вандравання па ўкраінскіх гарадах, адмовіла арганізатарам. У афіцыйным лісце гэта тлумачыцца тым, што выбранае пад фестываль месца на беразе Дзісны з'яўляецца ландшафтна-рэакцыйнай зонай агульнагарадскога значэння. Канцэрт там можа прывесці да нанясення шкоды, у прыватнасці да «знішчэння асобных відаў раслінаў».

Арганізатар фэсту Віталь Супрановіч паведаміў, што вядуцца перамовы з іншымі ўкраінскімі гарадамі. І калі хутка ўдасца вырашыць арганізацыйныя пытанні, Be Free не давядзецца адкладаць на год, хіба перанесці на верасень.

«З нефармальных крыніц мы даведаліся, што чарнігаўскія ўлады знаходзяцца ў кантакце з афіцыйным беларускім бокам, які настойліва радзіць не дазваляць фэст, — кажа Супрановіч. — Такім чынам, лёс міжнароднага фестывалю дэ-факта знаходзіцца ў руках беларускіх уладаў».

Рок фестываль Be Free ўзнік у 2007 пад назвай «Права быць свабодным». У папярэднія гады ён праходзіў на захадзе Украіны — у Луцку і Львове. Летась адбыўся ў Чарнігаве, дзе вырашылі праводзіць яго і надалей. Удзел у ім бралі «Ляпіс Трубяцкой», «Воплі Відаплясава», «Крама», :B:N, Pomidor/OFF, «Зніч». Сёлета фэст меў прайсці 21—23 жніўня.

**Сяргей Макарэвіч**

## Сцісла

• **Пра Вайцюшкевіча напісалі кнігу.** Яна пабачыць свет у выдавецтве «Кнігазбор». За назву выдання ўзяты радок з верша Рыгора Барадуліна, аднаго з аўтараў песняў Вайцюшкевіча, — «Беларускае слова ад спеву». Зрабіць кнігу прапанаваў сам Зміцер Вайцюшкевіч на канцэрце з нагоды ўласнага дня нараджэння. У кнізе — публікацыі, фота, тэксты песняў.

• **Конкурс «Славянскага базару» выйграў славянін заходні.** Уладальнікам Гран-пры конкурсу выканаўцаў на фестывалі «Славянскі базар у Віцебску» стаў Дамір Кеджа з Харватыі. Яму быў уручаны Гран-пры ў памеры $10 тыс. У конкурсе выканаўцаў бралі ўдзел 19 канкурсантаў.

• **Літоўскі прэм'ер праедзе па «гістарычных літоўскіх землях» Беларусі на роверы.** Ад 25 ліпеня да 1 жніўня прэм'ер-міністр Літвы Андрус Кубілюс у складзе велагрупы колькасцю 30 чалавек праедзе па тэрыторыі Беларусі. Літоўцы праедуць праз Ліду і Нясвіж. Разам з літоўскім прэм'ерам у велапаход выправяцца прадстаўнікі партыі «Саюз Айчыны — Хрысціянскія дэмакраты Літвы», а таксама міністр сацыяльнай абароны і працы Данатас Янкаўскас і міністр эканомікі Дайнюс Крэйвіс.

# Частка VIII. Полацк. Паўночная версія

Піша **Алег Дзярновіч**.

Працяг. Пачатак у №26, 28, 30, 39, 47 за 2009 год, №7, 22 за 2010 год.

Пакуль паўднёвы ўсход Беларусі знаходзіўся зусім блізка ад эпіцэнтру магчымай далейшай усходняй версіі развіцця гісторыі ўсёй Усходняй Еўропы, на поўначы адбываліся падзеі, якія потым шмат у чым прадвызначаць далейшы бег часу. Гутарка, вядома, пойдзе пра Полацк.

У VII—IX стагоддзях паўднёвы ўсход Беларусі зазнаваў моцны ўплыў Хазарскага каганата — дзяржавы, якая магла надаць усходні, азіяцкі вектар усёй нашай гісторыі. Тым часам на поўначы адбываліся падзеі, якія ў далейшым перакрэслілі гэтую магчымасць. Іх эпіцэнтрам быў Полацк.

## Балты ў Полацку хаваліся, славяне — жылі

Сёння мы маем значны археалагічны матэрыял, які дазваляе ўявіць старажытны горад. Да прыходу крывічоў (ці складання іх як супольнасці) на старажытнае Полацкае гарадзішча яно належала балцкім плямёнам днепра-дзвінскай культуры. Яны і далі назву рацэ — Палата, ад якой потым было названае паселішча. Але старажытныя балты стала ў Полацку не жылі. Цяжкадаступнае гарадзішча яны выкарыстоўвалі ў якасці сховішча на час небяспекі. Яно не мела такіх спецыфічных гарадскіх функцый, як палітычны, адміністратыўны і гандлёвы цэнтр. Кансерватыўныя супольнасці ўсходніх балтаў на беларуска-літоўскіх абшарах у IX ст. так і не падышлі яшчэ да стадыі ўтварэння гарадоў. Для значных сацыяльных зменаў спатрэбіліся заходнебалцкія, славянскія і скандынаўскія ўплывы.

Толькі са з'яўленнем крывічоў Полацк пачынае развівацца як горад. Пра гэта ў першую чаргу сведчыць утварэнне пасаду вакол умацаванняў. Разам з дзядзінцам агульная плошча горада ў IX—X ст. складала не меней за 7 га, і там магло жыць каля 4 тысяч чалавек. Але ўжо ў XI—XII ст. плошча горада павялічылася да 80 га.

Полацк IX ст. знаходзіўся на тэрыторыі, вядомай сёння як Гарадзішча — гэта на паўкіламетра паўночней ад Сафіі, на правым беразе Палаты. Такая адлегласць (800 метраў) ад Дзвіны невыпадковая. У тыя часы было выгадна будаваць паселішчы на берагах вялікіх рэк. Але адначасова дазваляла захопнікам імкліва пад'ехаць на вялікай колькасці чаўноў і ўварвацца ў горад ад ракі. Таму паселішча звычайна закладалі на прытоку галоўнай ракі, непадалёк ад упадзення ў яе. Толькі значныя і абароненыя гарады дазвалялі сабе размяшчацца на берагах вялікіх рэк.

## Пацвердзіць старажытнасць Полацка дапамаглі арабскія грошы

Пра тое, што Полацк IX ст. меў протагарадскую структуру, сведчыць наяўнасць побач з умацаваным дзядзінцам («Гарадзішчам») неўмацаваных селішчаў па берагах Палаты — зародкаў будучых пасадаў, на якіх і адбывалася ўсё гаспадарчае жыццё. На гэтых селішчах была знойдзеная кераміка VIII ст., якую археолаг Георгій Штыхаў вызначыў як славянскую. Такім чынам, выглядае, што мігранты-славяне мелі непасрэднае дачыненне да ўзнікнення Полацка.

Доўгі час расійскія археолагі адмаўляліся прызнаваць, што Полацк да X ст. выконваў функцыі горада. Праблема з археалагічным Полацкам сапраўды існавала, бо не было выяўлена культурных пластоў з рэчамі, якія можна было б дакладна датаваць першай паловай IX ст. Усе аргументы беларускіх даследчыкаў грунтаваліся пераважна на фрагментах керамічнага посуду, якім продкі палачанаў карысталіся ў VIII—IX ст. Толькі ў 2009 на Полацкім гарадзішчы быў выяўлены пласт пажарышча, а ў ім знойдзеныя выдатныя храналагічныя маркеры: фрагменты ўніверсальнай валюты таго часу — срэбныя арабскія дырхемы, якія датуюцца 800—825 г.

Чаму гэтая розніца ў паўстагоддзя-стагоддзе важная? Бо на археалагічны матэрыял наўпрост кладуцца падзеі, апісаныя ў рускіх летапісах. Якія ж эпізоды з ранняй гісторыі Полацка мы можам прыгадаць? У IX—X ст. такіх няшмат.

## Першы вядомы валадар — Рурык?

Полацк успамінаецца ў «Аповесці мінулых гадоў» у наўпростай звязцы з легендай пра «запрашэнне варагаў». Каротка нагадаю гэты хрэстаматыйны сюжэт. У 859 г. славянскім і фінскім народам поўначы Усходняй Еўропы ўдалося пазбыцца залежнасці ад варагаў. Але ўжо праз два гады, сведчыць летапіс, праз тое, што запанаваў хаос, самі гэтыя народы зноў запрашаюць сабе ўладароў са Скандынавіі — русь. Запрошаныя былі тры браты: Рурык, які «сеў» у Ноўгарадзе, Сінеус — на Белавозеры, і Трувар — у Ізборску.



Такім уяўляўся Рорык Ютландскі нідэрландскаму гравёру XIX ст.

Яшчэ праз два гады браты Рурыка паміраюць, і той пачынае раздаваць сваім набліжаным варагам новыя падуладныя яму гарады (землі). Тут мы і сустракаем першую прыгадку Полацка ў пісьмовых крыніцах — пад 862 г., але апавядаецца тут пра падзеі 864 г. Такім чынам, Полацк трапляе ў арбіту палітыкі, якую праводзіў Рурык з мэтаю падпарадкавання паўночнай часткі шляху «з вараг у грэкі» — галоўнага гандлёвага маршруту ўсходу Еўропы тых часоў.

## Легітымізацыя ўлады Рурыка праз класічны сюжэт

Сучасная гістарыяграфія скептычна ставіцца да факту існавання братоў Рурыка. Гістарычна-лінгвістычныя даследаванні паказваюць, што імя «Сінеус» ёсць скажэннем старажытнаскандынаўскага выразу «свой род» (sine hus), а «Трувар» — «верная дружына» (thru varing). Калі гэта так, дык Рурык прыйшоў уладарыць не з братамі, а са «сваім родам і вернай дружынай». Таму выказваецца меркаванне, што пры напісанні «Аповесці мінулых гадоў» выкарыстоўваліся больш раннія, невядомыя сёння шведскія крыніцы. А кіеўскі летапісец зрабіў проста транскрыпцыю на кірыліцу, не ведаючы добра скандынаўскай мовы.

Але што гэта магла быць за крыніца? Бо за перыяд IX—XII ст. вядомыя адно рунічныя надпісы, старажытныя шведскія і дацкія рукапісы з лацінскай графікай з'явіліся толькі ў першай палове — сярэдзіне XIII ст., нарвежскія — у другой палове XII ст. У любым выпадку, гэта пазней за час напісання «Аповесці мінулых гадоў», датаванай пачаткам XII ст. Магло быць, што «варажская легенда» спачатку перадавалася ў асяроддзі рускай дружыны ў вуснай форме на старажытнаскандынаўскай мове. Пазней, у сярэдзіне X ст., сярод дружыннікаў ужо панаваў білінгвізм, а на момант стварэння летапісу эліты Русі былі ўжо трывала славянамоўнымі.

Такім чынам, большасць сучасных даследчыкаў мяркуе, што Сінеус і Трувар «Аповесці мінулых галоў» — гэта персанажы літаратурныя. Але і сам аповед пра тое, як тры браты (бывае і два) ствараюць нейкае каралеўства, а адзін з іх становіцца каралём, — гэта старажытны індаеўрапейскі сюжэт. Праз гэты сюжэт адбывалася легітымізацыя новай улады.

## Рурык ці Рорык?

У такім разе паўстае пытанне — а ці існаваў сам Рурык? Тут якраз сумневаў менш. Упершыню Рурык прыгадваецца ў «Жыцці Святога князя Уладзіміра», напісанага, як мяркуецца, каля 1070 манахам Якавам. Уладзіміра аўтар называе праўнукам Рурыка. У «Аповесці мінулых гадоў», напісанай на сорак гадоў пазней, гісторыя варага Рурыка выкладалася падрабязна.




Ужо ў XIX ст. рабіліся спробы атаясаміць заснавальніка дынастыі Рурыкавічаў з якім-небудзь вядомым правадыром вікінгаў. У 1816 г. пастар Гольман апублікаваў у Брэмене кнігу, дзе ўпершыню правёў аналогію між Рурыкам і адным з найбольш паспяховых дацкіх конунгаў Рорыкам Ютландскім (стараскандынаўскі Hrorek, Hroerekr, у лацінізаванай форме Roric, Rorich, Rorik). Ідэю падхапіла нямецкамоўная прафесура Дэрпцкага (Тартускага) універсітэта, а ў 1920-я ўзнавіла і наноў абгрунтавала расійская эміграцкая гістарыяграфія ў Празе.

Рорык, як і многія вікінгі, меў авантурную біяграфію. У маладосці ён знаходзіўся ў цені свайго старэйшага сваяка Гаральда. У выніку кланавай барацьбы браты былі выгнаныя з Ютландыі — мацерыковай часткі Даніі (на паўвыспе) — і далей жылі нападамі на фрызскія берагі Паўночных Нідэрландаў. Урэшце імператар Захаду Лотар I палічыў за лепшае наняць Рорыка на службу і перадаў яму некалькі графстваў. Наўрад ці імператару прыйшлося шкадаваць — за час найміцтва Рорыка вядомыя толькі два напады нарманаў на Нідэрланды. У 854 г. гэты вікінг зноў увязаўся ў барацьбу за родную Ютландыю, але ягоныя дацкія заваяванні не былі доўгатрывалымі. У 863 г. Рорык знікае са старонак заходніх аналаў, а з'яўляецца толькі ў 870 як «кароль варвараў» у Фрызіі. «Цьмяныя» 863—870 і даюць гісторыкам падставы атаясамліваць Рорыка з Рурыкам. Яшчэ адзін аргумент, здабыты ў другой палове XX ст. археолагамі, — блізкая адпаведнасць археалагічных пластоў ютландскага горада Рыбе і Ладагі часоў Рурыка.

І ўсё ж няма ніякіх звестак пра паходы Рорыка на ўсход Еўропы. Хоць ёсць адна цікавая зачэпка — пасля 857, пасля таго як энергічнаму конунгу ўдалося завалодаць часткай Дацкага каралеўства, ён вымушаны быў збегчы, як мяркуюць, у Сярэднюю Швецыю, у важны гандлёвы і палітычны цэнтр шведскіх вікінгаў горад Бірка. Тут яго і маглі напаткаць пасլы Гастамысла.

Але новыя нечаканыя варыянты ў нашых гістарычных пошуках Рурыка могуць даць іншыя метады даследаванняў.

## Выклік генетыкі

У 2006—2008 па ініцыятыве рэдакцыі расійскай версіі часопіса Newsweek былі праведзеныя даследаванні ДНК прадстаўнікоў дынастыі Рурыкавічаў. Міжнародную групу навукоўцаў з Польшчы, ЗША і Расіі ўзначальваў польскі прафесар Анджэй Бажора. Для аналізу былі ўзятыя генетычныя матэрыялы ў 191 чалавека, якія лічаць сабе нашчадкамі Рурыкавічаў. Даследавалася мужчынская Y-храмасома, якая не ўдзельнічае ў рэкамбінацыі генаў і таму практычна без зменаў перадаецца ад бацькі да сына. Вынікі даследавання былі апублікаваныя на адкрытых старонках найбуйнейшай электроннай генетычнай базы дадзеных — FamilyTreeDNA.

Інфармацыя, прадстаўленая генетыкамі, а менавіта генагеографамі, прымусіла задумацца гісторыкаў ды адрадзіла старыя версіі. Вельмі выразна ў большасці абследаваных людзей была выяўленая гаплагрупа N3, якая мае фіна-вугорскае паходжанне. (Гаплагрупамі навукоўцы называюць наборы генетычных мутацый у ДНК чалавека, паводле якіх можна даведацца, адкуль прыйшлі ягоныя продкі). Распаўсюджанне гаплагруп зусім не цалкам супадае з этнасам, але частотнасць розных паказчыкаў можа казаць пра тэндэнцыі. Гаплагрупа N3 надзвычай рэдка сустракаецца ў іншых славянаў, але ў расійцаў яна адна з галоўных варыянтаў. Таксама даволі часта гэтая гаплагрупа фіксуецца ў шведаў і нарвежцаў — менавіта там, дзе скандынаўскія германцы наклаліся на фіна-вугорскі субстрат. А ў саміх фіна-вугорскіх народаў ад Фінляндыі і Эстоніі да Сібіры гэтая гаплагрупа самая пашыраная.



Імя Рурык (Rurikr) на фрагменце рунічнага каменя, які выкарыстоўваўся для пабудовы царквы Нарсунда ў Швецыі.

Фіна-вугорскае паходжанне Рурыкавічаў успрымаецца спачатку як нечаканасць. Але давайце прыгадаем, што і сама назва «русь», як лічыць большасць даследчыкаў, ёсць транфармацыяй заходнефінскага тэрміну ruotsi / rootsi, якім сёння абазначаюцца ўсе шведы. А ў даўнія часы фіны так называлі вікінгаў, якія збіралі даніну з мясцовага насельніцтва. Вікінгі досыць рана ўключылі ў свае абшары фінскія плямёны, фіны ж станавіліся ўдзельнікамі выправаў варагаў. Нават у князя Алега, які ў 882 выправіўся на Кіеў, чудзь (старажытнаруская збіральная назва заходнефінскіх плямёнаў) згадваецца ў ягоным войску на першым месцы пасля варагаў і перад славянамі.

Тут дарэчы сталі выпіскі расійскага гісторыка Васіля Тацішчава з так званага Якімаўскага летапісу. Толькі праз тыя выпіскі летапіс і вядомы. Дык вось, у інтэрпрэтацыі Тацішчава Рурык быў сынам невядомага варажскага князя ў Фінляндыі. Маці ж Рурыка была Уміла — дачка славянскага правадыра Гастамысла. Вешчуны парадзілі Гастамыслу, сыны якога згінулі маладымі, перад смерцю запрасіць сыноў Умілы на княжанне. Сюжэт выглядае надта архетыпічна, фальклорна, але фінскі «след» мы бачым і тут.

На гэтым сенсацыі ДНК-пошукаў не сканчаюцца. Тая ж група навукоўцаў высветліла, што і нашчадкі Гедыміна маюць фіна-вугорскае паходжанне...

Хто ж такі Рагвалод і як апісваюць Полацк ісландскія каралеўскія сагі — чытайце ў наступным выпуску «Гісторыі Беларусі».

# Расійская шпіёнка будзе судзіцца за свае інтымныя фота

Ганна Чэпмэн падае ў суд на былога мужа, які апублікаваў яе старыя эратычныя фатаграфіі. Чэпмэн абвінавацілі ў шпіянажы ў ЗША. Пасля арышту яе абмянялі на заходніх шпіёнаў у Расіі.

Асабістыя фатаграфіі Чэпмэн хутка з'явіліся ў прэсе. Яны былі зробленыя ў той час, калі недалугая расійская Мата Хары была замужам за брытанцам Алексам Чэпмэнам. Яе першы муж, праз якога яна легалізавалася на Захадзе, быў звычайным хлопцам, далёкім ад уплывовых колаў.

Здымкі маюць эратычны характар. Чэпмэн на іх зафіксаваная для гісторыі з садамазахісцкімі цацкамі і і прысоскамі на цыцкі. Шлюб доўжыўся ўсяго два гады. Імаверна, жыццё са звычайным брытанцам мала цікавіла начальства Чэпмэн, сапраўднае прозвішча якой — Кушчанка. І яна адправілася за акіян ужо як Чэпмэн — ідэальная трансфармацыя для шпіёнкі. Падмануты муж ахвотна апублікаваў фатаграфіі, калі грымнуў скандал.

У Нью-Ёрку Чэпмэн афіцыйна працавала кіраўніком сайта нерухомасці.

26 чэрвеня з Чэпмэн пад выглядам расійскага выведніка «Рамана» звязаўся супрацоўнік ФБР. Ён па тэлефоне прызначыў ёй сустрэчу ў Нью-Ёрку.

Чэпмэн адразу западозрыла нядобрае. Раней яна не сустракалася з выведнікамі асабіста, а толькі абменьвалася зашыфраванымі дадзенымі праз закрытую кампутарную сетку.

«Раман» папрасіў яе асабіста перадаць іншаму «выведніку» фальшывы пашпарт. Раней Чэпмэн не атрымлівала такіх заданняў ад свайго «начальства» ў Маскве і не чакала атрымаць.

Пасля сустрэчы з «Раманам» Чэпмэн купіла мабільнікі і дзве сім-карткі для міжнародных званкоў. Яна патэлефанавала ў Маскву свайму бацьку — супрацоўніку расійскай разведкі, і сябру ў Нью-Ёрк, сказаўшы, што блізкая да правалу. Абодва параілі ёй адмовіцца ад гэтага задання. Бацька Чэпмэн Васіль Кушчанка параіў дачцэ аднесці фальшывыя дакументы ў паліцыю, што яна і зрабіла.


Вяселле Чэпмэнаў.

27 чэрвеня яна аднесла пашпарт у паліцыю і расказала, што адбылося. Паліцыянты выклікалі супрацоўнікаў ФБР, якія Чэпмэн арыштавалі. Так стартавала аперацыя па арышце ўсёй сеткі «нелегалаў».

Амерыканцы сачылі за сеткай дзясятак гадоў. Паводле іх ацэнкі, эфектыўнасць працы сеткі была нулявой.

**Сяргей Гезгала**

НАВУКА

## Чаму цемнаскурыя хутчэй бегаюць, а белыя — плаваюць

У людзей розных расаў розны цэнтр цяжару цела.

У бегу ў асноўным перамагаюць цемнаскурыя спартоўцы, а ў плаванні — еўрапеоіды. Каралём бегавога спрынту на апошняй Алімпіядзе стаў цемнаскуры Усэйн Болт з Ямайкі. А ў плаванні роўных не было «бледнатвараму» амерыканцу Майклу Фелпсу. Эдрыян Бежан з Універсітэта Дзюка і Эдвард Джонс з Корнэльскага ўніверсітэта (ЗША) сцвярджаюць, што гэта звязана з тым, што ў прадстаўнікоў розных расаў па-рознаму размешчаны цэнтр цяжару цела.

У цемнаскурых ён трохі вышэйшы, чым у белых. Гэтае біялагічнае адрозненне ўзнікла пад уздзеяннем культурна-гістарычных фактараў: умоваў клімату і гаспадаркі ў Афрыцы і Еўропе.

«Цемнаскурыя, як правіла, маюць даўжэйшыя канечнасці з меншым ахопам, таму пры аднолькавым росце іх цэнтр цяжару будзе вышэйшы ў параўнанні з белымі і азіятамі, у якіх магутныя торсы», — кажуць навукоўцы.

Розніца ў размяшчэнні цэнтру цяжару паміж людзьмі з цёмным і белым колерамі скуры складае 3%. Гэтае дае розніцу ў хуткасці ў 1,5% і дазваляе цемнаскурым перамагаць у бегу, а «бледнатварым» — у плаванні. Невялікая лічба, але ў спорце найвышэйшых дасягненняў, дзе значэнне маюць долі секунды, яна цалкам можа сур'ёзна ўплываць на вынікі спаборніцтваў.

Цікава, што цэнтр цяжару азіятаў размешчаны яшчэ больш спрыяльна для хуткага плавання, чым у белых. Але ў плаванні яны не перамагаюць, бо ростам ніжэйшыя.

«Рух — гэта бесперапынны працэс падзення чалавека наперад, маса падае, затым падымаецца, — патлумачыў Бежан. — Маса, якая падае з большай вышыні, падае хутчэй. У бегу вышыня «падзення» абумоўленая цэнтрам цяжару цела. Для хуткіх плыўцоў вялікія торсы дазваляюць целу «падаць» далей на моцных і хуткіх хвалях».


**Чорныя маюць даўжэйшыя канечнасці, а белыя — больш развіты торс. На фота: чалавек-амфібія, чэмпіён па плаванні Майкл Фелпс.**

**Паводле International Journal of Design and Nature and Ecodynamics**

ТЭХНАЛОГІІ

## Самалёт на сонечных батарэях ляцеў цэлыя суткі

Самалёт Solar Impulse, рухавік якога працуе выключна на сонечных батарэях, зрабіў першы кругласутачны тэставы палёт.

Унікальны апарат з пілотам узляцеў з вайсковага аэрадрома швейцарскага горада Паерн. За дзень палёту ён набіраў энергію ў свае 12 тыс. сонечных батарэй — каб зарадкі літыева-іённых акумулятараў хапіла на ноч.



Размах крыла Solar Impulse складае 63,4 метра, вага — усяго 1,6 тоны. Корпус выраблены са звышлёгкіх кампазітных матэрыялаў, рухаюць яго чатыры электраматоры магутнасцю 10 конскіх сілаў.

Solar Impulse быў спраектаваны падарожнікам Бертранам Пікарам, які ў 1999 ажыццявіў беспасадачны пералёт на паветраным шары вакол свету. У наступным годзе на Solar Impulse плануецца ажыццявіць пералёт праз Атлантычны акіян.

**БЕЛТА**

## Мяжу паміж Паўднёвай і Паўночнай Карэямі будуць ахоўваць робаты

Улады Паўднёвай Карэі пастанавілі размясціць на мяжы з КНДР двух патрульных робатаў. Такія робаты-паставыя здольныя самастойна весці назіранне за дэмілітарызаванай зонай, выяўляць парушальнікаў і абстрэльваць іх. Машыны распазнаюць чалавека па цеплавым выпраменьванні, з дапамогай датчыка руху, а таксама па голасе.

У выпадку, калі эфектыўнасць робатаў будзе пацверджаная, Паўднёвая Карэя сфармуе некалькі рабатызаваных падраздзяленняў. Кошт аднаго робата складае $ 330 тыс.

Дэмілітарызаваная зона, створаная ААН у 1953 годзе, аддзяляе свабодную Карэю ад камуністычнай. Апошнія некалькі гадоў яна з'яўляецца палігонам для выпрабавання новых відаў узбраенняў.



**korrespondent.net**

НЕ ЎСЁ ТАК ДРЭННА

## Эяф'ядлаёкюдль заснуў — Катла не абудзілася

Вывяржэнне вулкана ў Ісландыі, якое стварыла вялізныя праблемы для еўрапейскіх авіязносінаў вясной, відавочна, скончылася, паведамляюць навукоўцы.

Цяпер з жарала Эяф'ядлаёкюдля вывяргаецца ўжо не вулканічны попел, а пара. Як паказваюць замеры шведскіх станцый, найбліжэйшы вулкан Катла, наступнага вывяржэння якога так баяліся, не падае ніякіх прыкметаў актыўнасці.

**Шведскае радыё**

КЛІМАТ

## Ад спёкі ў Вільні бясплатна раздаюць ваду

Пункты раздачы з'явіцца ў шэрагу кавярняў, на прыпынках грамадскага транспарту, каля медустановаў, на цэнтральных плошчах.

Яна будзе разліваецца з аўтаматаў і раздавацца ў пластмасавых бутэльках.

Больш чым тыдзень у нашым рэгіёне трымаецца спёка да 35 градусаў.

**СГ**

СУСЕДЗІ

## Былыя ўладанні сям'і Камароўскага прываблiваюць турыстаў

Фальварак продкаў польскага прэзідэнта Браніслава Камароўскага ў Кавалішках (Літва) трапіў у спіс турыстычных маршрутаў палякаў.

Зацікаўленасць цешыць жыхароў паўтаратысячнага мястэчка. Яны разлічваюць на адраджэнне мястэчка, размешчанага каля мяжы з Латвіяй.

Продкі Камароўскага жылі ў Кавалішках 300 гадоў. У маёнтку было 2200 га зямлі і асабняк, пабудаваны ў XVIII ст. Палац меў 27 пакояў, 2 салоны, більярдны пакой, бібліятэку і вялікі сталовы пакой. У маёнтку была і кандытарская фабрыка. Пасля 1944-га ў ім размяшчаўся народны суд. У 1982 будынак быў знесены, а на яго месцы пабудавалі школу.

Да сённяшняга захаваліся будынак фабрыкі, парк і сажалка. На ўпарадкаванне пазасталага маёнтку са структурных фондаў ЕС было выдаткавана 835 000 літаў (прыкладна $300 тыс.). На гэтыя сродкі на працягу году будзе будавацца парк, адбудзецца рамонт дома культуры.

**«Lietuvos Žinios»**



ІХ ПРАБЛЕМЫ

## У Швецыі пабудавалі прыбіральню для чаек

У шведскім горадзе Карлстад у бухце Марыберг пабудаваная спецыяльная платформа, якая павінна стаць прыбіральняй для чаек. Ідэя стварэння незвычайнага будынка належыць мясцоваму муніцыпалітэту. Ён прыняў такое рашэнне ў сувязі са скаргамі, якія паступаюць ад яхтклубаў. Уладальнікам яхт надакучыла, што птушкі спраўляюць свае патрэбы на іх уласнасць.

Раней чаек спрабавалі адганяць ад караблёў і прычалаў з дапамогай пудзілаў. Аднак птушкі хутка прывыкалі і пераставалі на іх рэагаваць.

**КаМ**

КАХАННЕ І СЭКС

# Мужчынская сэксуальнасць расце на сонцы

Справа ў тым, што разам з узроўнем вітаміну D у мужчынскім арганізме расце канцэнтрацыя полавога гармону тэстастэрону. Найбольшай сэксуальнасцю валодаюць тыя прадстаўнікі моцнай паловы, у чыёй крыві ўтрымліваецца не меней за 30 нанаграмаў «сонечнага вітаміну» на мілілітр, сцвярджаюць даследчыкі з Медычнага ўніверсітэта Граца (Аўстрыя).

Сярэдняе ўтрыманне тэстастэрону на працягу году значна вагаецца. Гэтак, з кастрычніка, калі сонечная радыяцыя змяншаецца, узровень абодвух рэчываў (вітамін D, тэстастэрон) значна зніжаецца. Мінімальнага значэння тэстастэрон дасягае ў сакавіку. Менавіта ў гэтыя месяцы зніжаецца і мужчынскае лібіда.

Тэстастэрон, што выдзяляецца клеткамі Лейдзіга ў семянніках, рэгулюе сперматагенэз і полавыя паводзіны, а таксама ўплывае на азоцістыя і фосфарныя абмены.

«Сонечны» вітамін, паводле навукоўцаў, таксама здольны зніжаць рызыку захворвання на рак. Даследаванні паказалі, што тыя, хто мае найбольшую канцэнтрацыю вітаміну D у крыві, хварэюць на анкалагічныя хваробы на 40% радзей.

Аднак сонца здольнае і шкодзіць: празмернае загаранне не дае карысці арганізму. Наадварот, хто пячэцца на сонцы, рызыкуе захварэць на рак скуры. Дый проста вымучваецца хутчэй. Таму баўце час на вольным паветры, але не загарайце спецыяльна.

**Ганна Котка**





**Жанна Капуснікава. Штраф.**
**3 725 000 рублёў.**



**Марына Капілава. Матроны.**
**32 млн рублёў**

# АртКірмаш

У Мінску праходзіць летні «АртКірмаш». Больш за дваццаць артыстаў, цвет сучаснага мастацтва, выставілі свае творы на продаж **у галерэі «Ў» (пр.Незалежнасці, 37а)**.

«АртКірмаш» дае магчымасць не толькі набыць сабе ўпадабаны твор, але і атрымаць шырокае ўяўленне пра сучаснае мастацтва. Апроч некалькіх карцін кожнага з выстаўленых мастакоў можна пабачыць іншыя іх творы ў фармаце відэашэрагу.

Акрамя гэтага на «АртКірмашы» прадугледжаныя зніжкі: штодзень працы пэўнага мастака будуць прадавацца па зменшаным кошце. Вы зможаце пабачыць і набыць графіку і керамічныя пласты Тамары Сакаловай, фотарэалістычны жывапіс Аляксандра Некрашэвіча, працы Зоі Луцэвіч, палотны Руслана Вашкевіча, прынты і вышытыя аб'екты Аляксея Лунёва і яшчэ шмат чаго цікавага.

Дык колькі каштуе сучаснае мастацтва? Калі ласка — фотаздымак з серыі «Горад сонца» фотамастака Артура Клінава ацэнены ў 360 тыс. рублёў (гэта без зніжкі). Крыху даражэйшая графіка: працы Сяргея Балянка — ад 560 тыс. Карціну Жанны Капуснікавай «Штраф» можна прыдбаць за 3 мільёны 725 тысяч. Самыя дарагія — статуэткі і скульптуры: вось «Матроны» Капілавай — амаль 32 мільёны.

АртКірмаш» працягнецца да 31 ліпеня, а арганізатары заклікаюць нас натхняцца і купляць беларускае.

**ЛК**

## КАНЦЭРТЫ

**Neuro Dubel**

**22 ліпеня а 20-й у Jolly Roger Cafe (вул. Талбухіна, 4)** выступае Neuro Dubel. Квіткі: 30 000 (танцпляц), 35 000 (месца за столікам). Даведкі: (029) 671–58–65, (029) 254–49–09.

**Канцэрт супраць касетных бомбаў**

**1 жніўня ў клубе «Графіці» (зав.Калініна, 19)** адбудзецца канцэрт, прысвечаны ўступленню ў сілу Міжнароднай канвенцыі ААН аб забароне касетных бомбаў «Beat the drum». Бяруць удзел гурты **BLAGI MAT!** і **VOLK**. **Пачатак а 19-й.**

## ІМПРЭЗЫ

**Рыцарскі фэст у Мсціславе**

Свята сярэднявечнай культуры адбудзецца **24—25 ліпеня**. Старажытны Мсціслаў будзе прымаць рыцараў і іх прыгожых дам трэці год запар. У фэсце возьмуць удзел больш за два дзясяткі рыцарскіх клубаў. Фэст пачнецца раніцай у царкве Аляксандра Неўскага і Кармеліцкім касцёле малебнамі ў гонар воінаў-мсціслаўцаў, якія загінулі за Айчыну на полі бітвы. Потым — святочнае тэатралізаванае шэсце, якое ачоліць на кані сам кароль Ягайла! Адбудзецца навукова-практычная канферэнцыя, прысвечаная гісторыі Мсціслава. Побач будзе працаваць «Мсціслаўскі скляпок», дзе можна асвяжыцца — прадэгуставаць вінныя і безалкагольныя напоі. Для ўдзельнікаў і гасцей фэсту будзе гатаваць сярэднявечная кухня. У гарадскім парку запрацуе Горад майстроў. На свяце выступяць «Песняры», агнявы цырк. Будзе лазернае шоу і феерверк. Сярэднявечная дыскатэка познім суботнім вечарам запрашае моладзь, а білет на яе каштуе 1200 рублёў. На Замкавай гары будуць праходзіць рыцарскія турніры. Уваход на іх платны, праўда, білеты каштуюць зусім нядорага. Каб трапіць на турніры мечнікаў і лучнікаў, трэба заплаціць 1100 рублёў, а каб назіраць за рознымі бугуртамі — 1500 рублёў. Пра начлег і харчаванне гасцям «Рыцарскага фэсту» раяць паклапаціцца загадзя. Жыць можна нават у спальных карпусах старажытнага езуіцкага манастыра, на тэрыторыі якога будзе працаваць і міні-кафэ. Дадатковую інфармацыю атрымайце ў аддзеле культуры Мсціслаўскага райвыканкама (02240) 20-967.

**Ракуцёўскае лета**

Літаратурны музей Максіма Багдановіча і Маладзечанскі райвыканкам запрашаюць на свята паэзіі і песні «Ракуцёўскае лета — 2010» **25 ліпеня а 12-й**. У вас будзе добрая нагода дакрануцца да высокай паэзіі ў выкананні аўтараў, ужо шырока вядомых і маладых, усцешыцца беларускімі песнямі і танцамі, а самае галоўнае — прайсціся сцежкамі слаўнага паэта Максіма Багдановіча, наталіць смагу з чыстай сцюдзёнай крыніцы, Максімавай крыніцы натхнення… Філіял **«Фальварак Ракуцёўшчына» знаходзіцца ў в. Ракуцёўшчына.** Дабрацца можна электрычкай Мінск — Маладзечна, даехаўшы да станцыі Уша. Адпраўленне з Мінска: 8.29, 9.14, 10.01, 11.23.

## ФУТБОЛ

**Ліга Еўропы ў Барысаве і Магілёве**

**22 ліпеня** пройдуць матчы ў адказ другога кваліфікацыйнага раунду Лігі Еўропы. У Барысаве жодзінскае «Тарпеда» прыме сербскі ОФК (стадыён у горадзе БелаАЗаў не адпавядае нормам УЕФА). **Пачатак а 18.00.** А ў Магілёве «Дняпро» згуляе з нарвежскім «Стабекам». **Пачатак а 19.00.** Першыя матчы гэтых каманд скончыліся з аднолькавым лікам 2:2. Ён пакідае беларусам добрыя надзеі на працяг барацьбы. Таксама ў гэты дзень у Таліне мінскае «Дынама» падужаецца з эстонскім «Калевам». У першай гульні беларусы былі мацнейшыя 5:1.

## ВЫСТАВЫ

**«Грунвальд за смугою часу»**

600-гадовы юбілей Вялікай Перамогі прынёс новыя творы і новае таленавітае прачытанне дзвюх важных тэм у нашай айчыннай гісторыі. **У Літаратурным музеі Багдановіча (вул. Багдановіча, 7а) да 1 жніўня** працуе выстава, прымеркаваная да гадавіны Грунвальду.

**Гіганты ледавіковага перыяду**

**У Гістарычным музеі (вул.Маркса, 12) да 29 жніўня** працуе выстава «Гіганты ледавіковага перыяду» з фондаў Дзяржаўнага музея гісторыі Санкт-Пецярбурга «Петрапаўлаўская крэпасць». Мадэлі жывёл для выставы адноўленыя па шкілетах даўніх вымерлых істот. Для гэтага выкарыстоўваліся сучасныя кампутарныя праграмы з трохмернай графікай. Экспанаты рухаюцца і могуць рыкаць!

**Выстава Барыса Казакова**

**29 ліпеня а 17-й у мастацкім музеі** — адкрыццё рэтраспектыўнай выставы Барыса Казакова «Паэзія ў будзённасці».

**«Chrysalis»**

**У галерэі «Ў» (пр. Незалежнасці, 37а) да 31 ліпеня** працуе выстава Надзеі Макеевай «Chrysalis», створаная паводле матываў апавядання Рэя Брэдберы «Пераўтварэнне». Апавяданне размяркоўваецца на 22 аркушах такім чынам, каб візуальна падкрэсліць кампазіцыйную змену тэксту, і падмацоўваецца шэрагам разнастайных аб'ектаў: фатаграфічныя калажы, інструменты і мадэлі коканаў.

**Belart.by**

**У Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва (пр.Незалежнасці, 47) да 8 жніўня** працуе графічная выстава «Belart.by. Маладыя мастакі Беларусі».

**Піктарыяльная фатаграфія**

**У Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва да 1 жніўня** працуе выстава піктарыяльнай фатаграфі «Працяг». Тэрмін «піктарыяльная фатаграфія» (англ. pictorial — маляўнічы, карцінны) прапанаваны ў 1869 г. англійскім фатографам Г. Робінсанам. Працы выкананыя ў аўтарскіх ручных піктарыяльных тэхніках: паліхромія, алавяны працэс, гуміарабік, цыянаціпія, бромафорт і расфарбоўванне срэбных адбіткаў.

**Загадкавы Кітай**

**У галерэі Нацыянальнай бібліятэкі да 1 верасня** працуе фотавыстава Лолы Підлускай «Загадкавы Кітай». Працуе майстар у розных жанрах — краявід, архітэктурныя здымкі, анімалістыка, партрэт.

**Гарадскія замалёўкі**

**У музеі сучаснага выяўленчага мастацтва (пр.Незалежнасці, 47) да 29 ліпеня** працуе фотавыстава Генадзя Карчэўскага «Гарадскія замалёўкі». Генадзь Карчэўскі — вядомы фотамастак у тэхніцы «змазанага кадра» і таксама «рэзкага кадра з размытымі аб'ектамі».

**Беларускія ўзоры**

**У Музеі беларускага народнага мастацтва (Раўбічы) да 31 жніўня** працуе выстава «Беларускія ўзоры»: пляценне з прыродных матэрыялаў, кераміка, аплікацыя саломкай, ручная коўка, разьба па дрэве.

**Свет з вышыні**

**У Доме-музеі Ваньковічаў у Мінску (вул. Інтэрнацыянальная, 33а) да 20 верасня** працуе выстава маляваных картаў Рубена Атаяна «Свет з вышыні».

## ТЭАТРЫ

**21 ліпеня**

**Купалаўскі тэатр** — «Не мой»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Адамавы жарты»

**22 ліпеня**

**Купалаўскі тэатр** — «Не мой»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Адамавы жарты»

**23 ліпеня**

**Купалаўскі тэатр** — «Паўлінка»
**Тэатр імя Горкага** — «Эсфір»

**24 ліпеня**

**Тэатр імя Горкага** — «Эсфір»

**25 ліпеня**

**Купалаўскі тэатр** — «Чорная панна Нясвіжа»

**26 ліпеня**

**Купалаўскі тэатр** — «ГендэльБах»

**27 ліпеня**

**Купалаўскі тэатр** — «Тэатраманія»
**Тэатр імя Горкага** — «Рускія вадэвілі»
**Купалаўскі тэатр** (Малая сцэна) — «Офіс»

**28 ліпеня**

**Тэатр імя Горкага** — «Пане Каханку»
**Купалаўскі тэатр** — «Тэатраманія»
**Купалаўскі тэатр** (Малая сцэна) — «Офіс»

**29 ліпеня**

**Купалаўскі тэатр** — Нясумны юбілей. Да 90-годдзя тэатра.

## КІНО

### Драпежнікі

**Predators**
ЗША, 2010, каляровы, 106 хв.
**Рэжысёр:** Німрод Антал
**Ролі выконваюць:** Эдрыян Броўдзі, Тофер Грэйс, Алісі Брага, Дэні Трэха, Уолтан Гогінс, Лорэнс Фішберн
**Жанр:** Фантастычны баявік
**Адзнака:** 5 (з 10)




Купка людзей закінутая невядома кім у джунглі. Сярод іх — амерыканскі дэсантнік, ізраільская снайперка, серыйны забойца, японскі якудза. Героі — на паляўнічай планеце Драпежнікаў, і яны — здабыча.

Карціна Німрода Антала — спроба ажывіць персанажаў, з якімі ўжо аднойчы змагаўся Арнольд Шварцэнегер. Знятая ў далёкім 1987 годзе стужка «Драпежнік» была папулярнай. На хвалі поспеху знялі працяг і кінаскрыжавальнікі, дзе Драпежнікі змагаліся супраць Чужынцаў. Эпігоны не ўражвалі. Сёлетняя карціна — прадусарская песня Роберта Радрыгеса, які даўно захапляўся членістаногімі паляўнічымі.

Джунглі, драпежнікі, бойка на мячах паляўнічага і якудзы, замест Шварцэнегера — касцісты Эдрыян Броўдзі.

Не найгоршая стужка ў сваім жанры.

**Андрэй Расінскі**

# Марскія канькі ў нашых рэках

Сёлета на Дняпры падчас навуковага даследавання вылавілі рыбу нябачанага раней у Беларусі віду. Гэта іголка-рыба пульхнашчокая (Syngnathus abaster). Водзіцца яна ў Чорным, Азоўскім і Каспійскім марах. Рыба мае танклявае, падобнае да іголкі цела — цёмна-шызае са светлымі папярочнымі палосамі. Вырастае да 20 см. А пульхнашчокай яе назвалі, бо мае пукатыя жабры. Рыба-іголка, мяркуюць адмыслоўцы, трапіла да нас з Кіеўскага вадасховішча. Цікава, што гэта рыба таго ж сямейства іголкавых, што і марскі канёк.

Толькі за два папярэднія гады ў нашай краіне выявілі шэраг новых відаў рыбаў— печкура белапёрага, бычка-цуцыка, калюшку паўднёвую малую, шчыпоўку залацістую. У Беларусі ўжо шырака распаўсюдзіліся такія чужародныя віды, як таўсталобік і ратан-галавешка. Яны добра прыстасоўваюцца да ўмоваў беларускіх вадаёмаў і складаюць канкурэнцыю прадстаўнікам аўтахтоннай фаўны.

За кошт росту колькасці чужога віду — карася срэбнага — зменшылася ў нас колькасць паўсюднага раней залатога карася. У беларускіх водах ужо трапіна чужародных відаў: 23 з 63! Палова відаў абарыгенных рыб і іншых водных арганізмаў знаходзіцца пад пагрозаю знікнення. За мінулае стагоддзе ў Беларусі зваліся два дзясяткі відаў самых каштоўных рыб: асятры атлантычны ды рускі, выразуб ды бялуга, ласосі. Такім чынам, хоць у нас і з'явіліся новыя рыбы, агульная колькасць відаў скарачаецца.

Праз Беларусь ідзе адзін з асноўных водных калідораў пранікнення чужародных відаў з Чарнаморска-Каспійскага басейна ў Цэнтральную і Заходнюю Еўропу і Балтыйскае мора. Калідор складаецца з басейнаў Дняпра, Прыпяці і Віслы.

З аднаго боку, распаўсюду чужародных відаў рыб у Беларусі спрыяе пацяпленне клімату, а з іншага — непапраўна зменена гідралогія. У выніку будавання плацінаў, меліярацыі, забудовы рэчышчаў у Беларусь, напрыклад, ужо не пранікаюць вугры і асятры. А ўварванне но-



Ратан — чэмпіён па з'ядані чужой ікры.

вых відаў з Усходу і Поўдня будзе толькі нарастаць.

Тыя новыя віды, што былі выяўленыя ў нашых водах, адносяцца да так званага пустазелля. Праз свае вельмі дробныя памеры яны не ўжываюцца ў ежу і не маюць прамысловага значэння. На што яны годныя — дык хіба быць жыўцом для лоўлі драпежных рыб. А вось ікру і малькоў каштоўных тутэйшых рыбаў прыбышы жаруць у велізарнай колькасці.

Чэмпіён тут — ратан-галавешка. Гэты далёкаўсходні від з'ядае ікру іншых відаў рыбаў, жабаў, трытонаў, ракападобных, чым наносіць велізарную шкоду нашым экасістэмам, а рыбным гаспадаркам — эканамічную шкоду.

Тое ж тычыцца і іншых водных жыхароў. Прыкладам, у выніку пашырэння толькі аднаго віду слімакоў, драйсены паліморфнай, ужо нанесеная адчувальная шкода ў вадасховішчах Лукомальскай ды Белаазёрскай электрастанцыяў. Гэты від слімакоў-чужынцаў сустракаецца ўжо больш чым у 80% азёр Беларусі. Слімак назапашвае моцныя таксіны і бактэрыі батулізму, ён смяротна небяспечны для рыб, якія ім сілкуюцца, і, праз рыб, для людзей. Інвазія ў Беларусь амеры-



Новы жыхар Дняпра — рыба-іголка.

канскага паласатага рака, носьбіта рачынай чумы, можа цалкам знішчыць папуляцыі каштоўных беларускіх відаў ракаў: вузкапальцавага і шыракапальцавага, унесеных у Чырвоную кнігу.

Выходзіць, ужо цяперашняе пакаленне беларусаў будзе жыць без рыбаў, якіх лавілі яшчэ іх дзяды. Калі ж не прыняць тэрміновых захадаў — знайсці біялагічныя спосабы ўздзеяння на шкоднікаў, перашкаджаць іх пранікненню, разводзіць каштоўныя віды рыбаў — дык неўзабаве ў многія рэкі ды азёры не будзе сэнсу і вуду закідаць.

**Сяргей Харэўскі**

## Сапраўдная беларуская кухня

### Смажаніна цялячая па-аматарску

1 вялікі цялячы кумпяк, 6 кг або больш, солі, 200—300 г саланіны, 200 г масла, 2—3 шклянкі цёртага сыру, 2—3 лыжкі сметаны, 2—3 прыгаршчы дробнай цыбулькі, кропу і зялёнай пятрушкі, 4—5 сухарыкаў.

Кумпяк добра ўкормленага цяляці пасаліць з вечара, зашыць у чыстую сурвэту або іншае палатно і закапаць у агародную зямлю на глыбіню ў локаць. Назаўтра зрання, пасля 12 гадзінаў ляжання ў зямлі, адкапаць і дастаць з палатна, але не абмываць.

Белы вясковы сыр, не вельмі свежы і не вельмі тлусты, нацерці на тарцы ў колькасці, якая адпавядае патрэбе, дадаць смятану, дробную цыбульку, кроп, зялёную пятрушку і зрабіць з гэтага густую масу.

Кумпяк вялікім нажом разрэзаць аж да косткі ў двух месцах (як бы на 3 агромністыя кавалкі). Прыгатаванай сырнай масай густа нашмараваць зрэзы мяса, зашчапіць іх краі бярозавымі штыфтамі, каб уся частка выглядала цэлым кавалкам і не распадалася, калі пры смажанні на ражне мяса будуць павяртаць. Увесь кавалак нашпігаваць саланінай.

Уздзець мяса на ражон і смажыць, паліваючы маслам і соўсам, які будзе выцякаць з мяса. Пры падачы дастаць бярозавыя штыфты і пасыпаць цёртым хлебам.

**З кнігі Вінцэнты Завадскай «Літоўская кухарка», 1854**
**Падрыхтавала НБ**

жытло

# Як атрымаць бясплатны пляц пад будоўлю хаты

**Каля 90 працоўных дзён сыходзіць на атрыманне зямельнага ўчастка ў «адным акне». Участкі ёсць у наяўнасці ў большасці рэгіёнаў.**

Грамадзянін, зацікаўлены ў атрыманні ўчастка, звяртаецца з заявай у адпаведны сельскі выканкам. З заявай падаецца пашпарт. Іншых дакументаў не патрабуецца.

Выканкам на працягу 3 дзён (тут і далей — працоўных дзён) запытвае ў адпаведных арганізацый дакументы, якіх не стае. Гэта даведка ЖЭСу пра займанае жылое памяшканне і склад сям'і заяўніка і даведка арганізацыі па дзяржрэгістрацыі нерухомай маёмасці аб адсутнасці (наяўнасці) правоў на аб'екты нерухомай маёмасці. Дакументы падаюцца ў выканкам за 5 дзён.

Калі рашэнне станоўчае, выканкам дае дазвол арганізацыі па землеўладкаванні на распрацоўку праекту адводу зямельнага ўчастка. Дазвол і дакументы накіроўваюцца ў арганізацыю па землеўладкаванні. Тая за 3 дні заключае з грамадзянінам дамову падраду на распрацоўку праекту.

У ёй прадугледжваюцца і працы па ўсталяванні межаў участка на мясцовасці, і паслугі па рэгістрацыі ўчастка і правоў на яго. На распрацоўку праекту адводу даецца 15 дзён з дня, калі грамадзянін аплачвае працы. За гэты час арганізацыя па землеўладкаванні абавязаная ўзгадніць праект з кіраўнікамі тэрытарыяльных органаў архітэктуры, Мінпрыроды, МНС, ДзяржсанНагляду.

Адначасова арганізацыя рыхтуе праект рашэння сельскага выканкама аб прадстаўленні зямельнага ўчастка, які ўзгоднены з праектам адводу зямельнага ўчастка, і перадае ўсе дакументы ў землеўпарадкавальную службу выканкама.

Там праект у 5 дзён разглядаецца і падаецца ў выканкам для прыняцця рашэння. Рашэнне выканкам прымае за 5 дзён.

Атрыманне ўчастка складаецца з двух этапаў: падрыхтоўка праекту і падрыхтоўка землеўпарадкавальнай справы па ўсталяванні межаў участка на мясцовасці. Першы этап сканчаецца, калі выканкам прымае рашэнне даць участак.

Пасля гэтага выканкам на працягу 3 дзён перадае сваё рашэнне з праектам адводу ўчастка зноў арганізацыі па землеўладкаванні — для ўсталявання межаў участка на мясцовасці і яго дзяржрэгістрацыі.

Тая на працягу 2 дзён пасля падрыхтоўкі землеўпарадкавальнай справы перадае заяву аб дзяржрэгістрацыі стварэння зямельнага ўчастка і ўзнікненні праву на яго ў арганізацыю па дзяржрэгістрацыі. Не больш за 10 дзён займаюць дзяржрэгістрацыя стварэння ўчастка і перадача землеўпарадкавальнай справы і пасведчання аб дзяржрэгістрацыі ўчастка адпаведнай землеўпарадкавальнай службе. Далей дакументы перадаюцца ўласніку ўчастка.

Гэта значыць, грамадзянін першы раз звяртаецца ў мясцовы выканкам, каб падаць заяву, і другі — каб атрымаць гатовыя дакументы на ўчастак.

З моманту падачы заявы да моманту выдачы гатовых дакументаў праходзіць 82 дні.

За падрыхтоўку землеўпарадкавальнай справы грамадзянін плаціць 3 базавыя велічыні і 1 базавую велічыню — за рэгістрацыю. Разам атрымліваецца сума, эквівалентная прыкладна 30 EUR. Прычым ён адразу аплачвае ўсе паслугі, а потым выконваюцца працы.

**belmarket.by**

## Прыватныя абвесткі

### ВАЛАНЦЁРСКІ ЛЕТНІК НА БРАСЛАЎШЧЫНЕ

**Рымска-каталіцкая парафія Божага Провіду ў Слабодцы (Браслаўскі раён)** запрашае вас узяць удзел у валанцёрскім летніку. Кожны, хто хаця б раз быў на Браслаўшчыне, наўрад ці абмінуў зрокам перліну Беларусі, Слабодкаўскі касцёл. У апошнія тры гады была зробленая рэстаўрацыя касцёла, але шмат што яшчэ патрабуе працы побач з касцёлам. Таму ўсіх, хто мае час і жаданне зрабіць унёсак, запрашаем на працу. Удзячныя за вашу ахвярнасць парафіяне дадуць памяшканне і харчаванне. Таксама ёсць магчымасць аплаты за квіткі. Адначасова адпачнеце на возеры, а ад святароў атрымаеце словы духоўнай апекі. Больш інфармацыі праз тэл. (029) 715–36–68

### ПАЛОМНІЦКІ ТУР

**Запрашаем у паломніцкі тур** Кракаў—Велеград—Прага—Вена—Браціслава з 9 па 16 жніўня. Экскурсіі выключна на беларускай мове. Больш падрабязна на сайце www.piligrymka.by. Т.: (029) 618–72–99, (029) 518–72–27

### КНІГІ

**Прадам** «Тлумачальны слоўнік беларускай мовы» ў 6 кнігах (Мінск, 1977 —1984). Т.: 298–16–62

Прадам Біблію за 5 тыс.руб. Т.: (0212) 25–80–79

### ВІНШАВАННІ

**Шчыра віншуем Аляксея і Антаніну Казанаў** з нараджэннем дачкі! Хай расце прыгожая, разумная, здаровая і шчаслівая! Сям'я Зайкіных

**Спадара Міхася Маліноўскага**, краязнаўца з горада Баранавічаў, віншую з 65–годдзем. Жадаю шчасця, здароўя, творчых поспехаў. Аляксей

**Рэдакцыя сайта www.honar.in віншуе** вас з 600–годдзем Вялікай Перамогі над тэўтонамі. Грунвальдская бітва даказала, што наш народ немагчыма скарыць. На жаль, апошнім часам назіраецца масавая алкагалізацыя і дэградацыя насельніцтва. Дык няхай жа гэтая перамога нагадае нам пра тое, што сіла — у адзінстве. Мы — адзін народ, нягледзячы ні на што. Слава Беларусі!

### СПАЧУВАННІ

**Памёр даўні падпісчык «Нашай Нівы»** ў Аўстраліі д–р Анатоль Бразоўскі. Выказваем спачуванні ягонаму сыну Алесю, іншым родным, сябрам. Шкада, што пасля спадара Анатоля ў яго сям'і не застаецца болей нікога, хто падпісаўся б на «НН». Дзякуй Вам, доктару Анатоль, за вернасць падпісчыка беларускай газеты. Хай далёкая зямля будзе Вам пухам.

**Прыватныя абвесткі ў «НН»** (не больш за 15 словаў) можна падаць бясплатна. Дасылайце поштай (а/с 537, 220050, Мінск) ці праз e–mail (nn@nn.by) або размяшчайце на форуме сайта www.nn.by. Дык скарыстайцеся!

колы

## Патрыманыя аўто патаннелі

Цэны на патрыманыя аўтамабілі ўпалі на 10-30%. Большасць увезеных раней аўто планавалася рэалізаваць на расійскім рынку. Аднак калі ў маі стала вядома, што Расія іх не пусціць, гэта абваліла беларускі рынак патрыманых аўтамабіляў. Цяпер прапанова на патрыманыя аўто значна перавышае попыт.

Аўтагоншчыкі прывезлі аўтамабіляў з запасам, з разлікам на будучы продаж расійскім купцам. Цяпер яны аказаліся ў пройгрышы. Каму трэба грошы, зніжае цэны. Іншыя рызыкуюць чакаць да наступнага году: пераход на расійскія мыты перанесены на 1 ліпеня 2011. З другога боку, ёсць падставы меркаваць, што Беларусь у Мытны саюз так канчаткова і не ўступіць.

**Сяргей Гезгала**

## Кемікі



1) Што можна пабачыць з заплюшчанымі вачыма?

2) Калі ўзяць сто літар «л», што атрымаецца?

3) Што выйдзе, калі побач напісаць 30 і я?

4) Веласіпедыст у горад едзе 1 гадзіну, а дадому 60 хвілінаў. Чаму так выходзіць?

**Сабрала Валянціна Карнялюк. Адказы глядзі на старонцы 16.**




Ва ўсіх рэгіёнах Беларусі пачалася ўборка збожжавых і зернебабовых. Зажынкі пад Койданавам.




Аляксандр Мілінкевіч наведаў Грунвальдскія ўрачыстасці ў Польшчы. І яўна рваўся ў бой. З прэзідэнтаў там прысутнічалі Браніслаў Камароўскі і Даля Грыбаўскайце.




Мінчане б'юць рэкорды па спажыванні халодных дэсертаў. Гэтаму спрые небывалая спёка. Штодня жыхады Мінска з'ядаюць 44 тоны марозіва. А 15 ліпеня яго раздавалі кіроўцам супрацоўнікі ДАІ падчас акцыі «Астудзіся!»




Мінскія рыбакі Валер і Зоя Анікейчыкі злавілі ў Прыпяці двухметровага сама вагой каля пяцідзесяці кілаграмаў.



Беларуская мадэлька Марына Лінчук стала тварам восеньска-зімовай рэкламнай кампаніі Blumarine. На фота няма нічога, акрамя знятай у руху прыгажуні-мадэлькі і вопраткі ад вядомага італьянскага брэнду. Назіральнікі за падзеямі ў свеце моды адзначаюць, што кар'ера Лінчук імкліва ідзе ўгору.




## Анекдоты

* * *

Якія будуць наступныя крокі ў інфармацыйнай вайне Мінска і Масквы? На Першым нацыянальным пакажуць інтэрв'ю з Барысом Беразоўскім, а на НТВ — «клубнічку» з удзелам асобы, падобнай да кіраўніка Беларусі.

* * *

Унучак пытае ў бабулі: — Бабуля, а чаму ў нас такія вялікія ногі?

— Каб мы маглі прайсці вялікі шлях, мой даражэнькі.

— А вушы такія вялікія нам навошта?

— Каб усё чуць, унучак.

— А насы ў нас чаму такія доўгія?

— Дык мы ж сланы...

* * *

Прыходзіш на працу, уключаеш кампутар. Вычышчаеш з пошты ўсіх, хто хоча заплаціць табе дзесяць мільёнаў даляраў...

* * *

— Алё, каханы! Я тут зусім адна, мне халодна і вельмі страшна... Ты сустрэнеш мяне? Я баюся адна вяртацца.

— Любая, ты проста, як будзеш выходзіць з ваннага пакоя, закруціся ў ручнік і ўключы святло ў калідоры!

* * *

Паважаныя жыхары!

Прыносім вам свае прабачэнні за расколіну, што ўтварылася ў фундаменце дамоў № 7, корпус 1, і № 7, корпус 2 (раней — дом №7).

Адміністрацыя ЖРЭУ-1.

## «НН» сто гадоў з вамі

**Параф'янава, Віленскай губ.** Недалёка ад нашага мястэчка ў аднаго гаспадара Ж. злодзеі хацелі ўкрасці каня. Уночы прыйшлі да стайні і, прарэзаўшы дзірку ў дзвярах, адзін з злодзеяў усунуў руку, каб адсунуць засаўку. Але гаспадар спаў у стайні і, узяўшы сякеру, адсек яму руку. Злодзеі ўцяклі, але другі раз, падпільнаваўшы, як гаспадар спаў у хаце, вывелі каня са стайні й давай крычаць: «Уставай, гаспадар, твайго каня ўкралі!» Гаспадар выбег, зладзеі яго схапілі і павезлі з сабой. Праз нейкі час цела гэтага чалавека знайшлі ў рэчцы.

**«НН». №28. 1910**

Сёння змяніць Лукашэнку можа толькі нашмат большая марыянетка Масквы, яшчэ больш цынічная й варожая нашым ідэалам. Ёсць пагроза ў другі раз трапіцца ў пастку 1994 года, калі, скіраваўшы ўсе сілы на барацьбу з Кебічам, беларуская правіца прывяла да ўлады непрадказальную сілу.

Па-сапраўднаму страшны ўжо не Лукашэнка. Жахнуцца нас прымусіць можа той чалавек, якога Лукашэнку падрыхтуюць на змену.

**«НН». № 29. 2000**

**Адказы на кемікі са старонкі 15:**

1) Сон. 2) Стол. 3) Зоя. 4) Гэта адно і тое ж.

**Наша Ніва**
незалежная газета
заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
шэф-рэдактар — Андрэй Дынько
галоўны рэдактар — Андрэй Генадзевіч Скурко
заснавальнік — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»
выдавец — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Мінск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА.** Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/0494179 ад 03.04.2009. Пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных абвестак. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №248 ад 22 чэрвеня 2009 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Мінск, вул. Асаналіева, 15–128. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Мінск, код 764.

**Наклад 6360.** **Газета выдаецца 48 разоў на год.**
Нумар падпісаны ў друк 23.00 21.07.2010.
Замова № 3488.
Рэдакцыйны адрас: Асаналіева 15–128.
Цана дамоўная.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
ISSN 1819-1614